*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 70 (6952) | 23 сакавіка 1941 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека им. В. И. Ленина

## ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

У абласцях БССР адбыліся нарады партыйнага, совецкага і калгаснага актыва, прысвечаныя рэалізацыі рашэнняў Соўнаркома СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі і аб асушэнні беларускіх балот.

Нарады падвялі вынікі мінулага сельскагаспадарчага года і намецілі канкрэтныя задачы па рэалізацыі рашэнняў партыі і ўрада, якія маюць гістарычнае значэнне для далейшага бурнага росквіту сацыялістычнага земляробства нашай рэспублікі.

Знамянальным быў мінулы, 1940 год у жыцці калгаснага сялянства нашай рэспублікі і ўсяго беларускага народа! Заваяваны новыя поспехі ва ўсіх галінах калгаснай гаспадаркі. Магутная сіла калгаснага ладу падняла сацыялістычнае земляробства на новую, яшчэ больш высокую ступень.

У барацьбе за высокі ўраджай, за павышэнне прадуктыўнасці жывёлагадоўлі выраслі новыя выдатныя людзі, якія накіроўваюць уперад грамадскую калгасную вытворчасць. Далёка вядомы такія энтузіясты сваёй справы, як даярка Елена Пішкевіч з калгаса «Чырвоны пуцілавец», Грэскага раёна, якая надаіла ад кожнай з 10 кароў па 3.000 літраў малака; свінарка з калгаса «Камбайн», Слуцкага раёна, Акуліна Семяновіч, якая вырасціла ад 5 свінаматак па 23,4 парасяці ад кожнай; аўчар Іван Рагалевіч з калгаса «Пяцігодка», Пухавіцкага раёна, які атрымаў ад 20 аўцаматак 50 ягнят і настрыг ад кожнай дарослай авечкі па 3 кілограмы воўны, і многія іншыя.

Аб гэтых бліскучых поспехах расказваецца ў друкуемым сёння ў «Звязде» зваротне нарады партыйнага, совецкага і калгаснага актыва Мінскай вобласці.

Поспехі калгасаў ва ўсіх галінах вытворчасці маглі-б быць значна большымі, калі-б не існаваўшая раней ураўнілаўка ў аплаце працы калгаснікаў. Пастанова партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі па нашай рэспубліцы кладзе канец гэтай несправядлівасці.

Новым вытворчым і палітычным узрыўмам адказвае калгасная вёска на клопаты партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб далейшым росквіце калгасаў, заможным і культурным жыцці калгаснікаў. Гэта высокае пачуццё ярка выказаў у сваім выступленні на нарадзе партыйнага, совецкага і калгаснага актыва Мінскай вобласці загадчык жывёлагадоўчых ферм калгаса «Кожінтэрн», Дзержынскага раёна, тав. Марозаў.

— Тры годы я працую загадчыкам ферм, — заявіў ён. — Але ніколі яшчэ не адчуваў такога творчага ўздыму, як зараз, пасля апублікавання сталінскага закона аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў. Вялікая сіла, таварышы, у гэтай пастанове. У кожным слове, у кожным сказе — усюды адчуваецца геній нашага вялікага правадыра Сталіна. Гэта ён клапоціцца аб нас, каб мы жылі добра.

З велізарнай радасцю і творчым узрыўмам сустрэла калгасным сялянствам і ўсім беларускім народам гістарычная пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей».

У рэспубліцы зараз разгортваецца вялікая падрыхтоўка да прадстаячых меліяратыўных работ. Калгасы, МТС і раёны бяруць на сябе абавязацельствы хутчэй ажыццявіць грандыёзную сталінскую праграму па ператварэнню векавечнай дрыгвы ў квітнеючыя палі і сенажаці.

«У 1941 годзе перад намі стаіць вялікая і сур'ёзная задача — асушыць у нашай вобласці не менш 17.000 гектараў балот і асвоіць пад пахаць і сенажаці 18.000 гектараў балотных зямель, — пішуць у зваротце ўдзельнікі нарады Мінскай вобласці. Гэта заданне мы лічым мінімальным. Мы прымем усе меры да таго, каб яго значна перавыканаць. Для гэтага неабходна своечасова правесці ўсе падрыхтоўчыя мерапрыемствы: падрыхтаваць поўнасцю неабходны інструмент і матэрыялы, распрацаваць у кожным калгасе падрабязныя планы меліяратыўных работ».

Звяртаючыся да ўсіх калгаснікаў, калгасніц, трактарыстаў і трактарыстак, камбайнераў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці, удзельнікі нарады заклікаюць зрабіць 1941 год годам новых слаўных перамог сацыялістычнага земляробства. Яны заклікаюць даць краіне больш збожжа, бульбы, кок-сагыза, ільну, мяса, малака, воўны.

Удзельнікі нарады заклікаюць змагацца за высокія паказальнікі ва ўсіх галінах калгаснай вытворчасці. Выкананне і перавыкананне гэтых абавязацельстваў з'яўляецца справай чэсці ўсіх калгасаў, МТС, усіх калгаснікаў, трактарыстаў, камбайнераў, ільноцерабільшчыкаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

Калгасная вёска знаходзіцца напярэдадні вялікіх работ. Надыходзіць веснавая сяўба і пачатак грандыёзных меліяратыўных работ. Поспех справы будзе залежаць ад таго, як кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый, работнікі зямельных органаў забяспечаць кіраўніцтва калгасамі, узначаляць актыўнасць мас.

Хуткае і высокаякаснае правядзенне веснавой сяўбы забяспечыць высокі ўраджай. Вось чаму ўдзельнікі нарады пішуць: «Наша задача — правесці веснавую сяўбу дружна, арганізавана, у максімальна сціслыя тэрміны, на высокім агратэхнічным узроўні».

А каб правесці сяўбу іменна так, трэба ўсебакова да яе падрыхтавацца. У кожным калгасе ўжо зараз павінна быць падрыхтавана добраякаснае насенне, поўнасцю адрамантаваны і праглежаны сельскагаспадарчы інвентар, машыны, вупраж, мабілізаваны ўсе рэзервы ўгнаенняў, створаны звенні па тэхнічных і гародных культурах.

Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для паспяховай вытворчасці натуральнага каучука. Удзельнікі нарады заклікаюць калгасы і калгаснікаў перавыканаць планы сяўбы кок-сагыза, сеяць гэту вельмі каштоўную тэхнічную культуру на сядзібах калгаснікаў, дабівацца высокай ўраджайнасці яе.

Намеціўшы канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі рашэнняў партыі і ўрада, абласці БССР заключылі паміж сабой дагаворы сацыялістычнага спаборніцтва. У гэта спаборніцтва павінны зараз уключыцца ўсе калгасы, МТС, раёны. Трэба дабіцца такога становішча, каб у нашай рэспубліцы сёлета не было адсталых калгасаў і раёнаў.

Хутчэй ператвараючы абавязацельствы ў жыццё, заваюем новыя перамогі сацыялістычнага земляробства!

## Сход комсамольскага актыва Мінска

У вялікай зале Дома партыйнай асветы адбыўся сход комсамольскага актыва г. Мінска з удзелам сакратароў гаркомаў і райкомаў комсамола абласці. З дакладам аб выніках XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і задачах комсамольскіх арганізацый выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Зімянін.

Рашэнні XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, — гаворыць тав. Зімянін, — з'яўляюцца праграмай дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці комсамола — бліжэйшага памочніка і баявога рэзерва нашай партыі. Мы павінны ўскрыць і знішчыць недахопы, якія тармозяць далейшую актывізацыю мас комсамольцаў і моладзі. Тав. Зімянін крытыкуе комсамольскія органы, якія да апошняга часу не ўдзялялі сур'ёзнай увагі рабоце прамысловасці і транспарта.

Комсамольскія арганізацыі зусім недастаткова скарыстоўваюць правы, прадастаўленыя ім XVIII з'ездам ВКП(б). Комсамольскія арганізацыі завода імені Кірава, імені Варашылава і іншыя, захапіўшыся ўнутрысаюзнымі пытаннямі, не ўваходзілі як след у справы сваіх прадпрыемстваў. Яны мірыліся з штурмаўшчынай, нарушэннямі тэхналагічнай дысцыпліны, з безгаспадарчым скарыстаннем інструментаў дапаможных матэрыялаў абсталявання. Тав. Зімянін ставіць пытанне аб арганізацыі эканамічнай вучобы комсамольскага актыва, глыбокага вывучэння тэхналогіі вытворчасці.

Дакладчык прыводзіць рад прыкладаў добрай работы комсамольцаў на прадпрыемствах Мінска.

Спыніўшыся на задачах комсамольскіх арганізацый па выкананню рашэнняў XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, тав. Зімянін завастрыў увагу на неабходнасці ўзмацніць барацьбу з нарушальнікамі працоўнай дысцыпліны, павысіць культуру вытворчасці, павысіць тэхнічную кваліфікацыю комсамольцаў, штодзённа выконваць і перавыконваць планы кожным комсамольцам і маладым рабочым.

У разгарнуўшыхся спрэчках удзельнікі схода расказалі аб першых кроках комсамольскіх арганізацый па выкананню рашэнняў XVIII канферэнцыі ВКП(б). Тав. Плаўнік (арцель «Пролетарый») прывёў прыклады авангарднай ролі комсамольцаў і моладзі на вытворчасці. Па ініцыятыве малодай работніцы тав. Рафал арцель асвоіла і зараз вырабляе з адыходаў дзіцячыя валёнкі, пасэы, сумачкі і іншыя прадметы шырокага спажывання.

Аб тым, як комсамольцы Барысава змагаюцца за эканомію і поўнае скарыстанне магутнасці прадпрыемстваў, гаварыў сакратар Барысаўскага гаркома комсамола тав. Крупкін. Па даручэнню Барысаўскага гаркома ЛКСМБ, тав. Крупкін выклікаў Мінскую арганізацыю комсамола на сацыялістычнае спаборніцтва за лепшае выкананне рашэнняў XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і правядзенне ўсесаюзных комсамольскіх гімнастычных спаборніцтваў.

Пытанню работы комсамольскіх арганізацый чыгуначнага вузла прысвяціў сваё выступленне намеснік начальніка паліт-аддзела па комсамолу 5-га аддзялення Заходняй чыгункі тав. Лаўчыноўскі. Ён звярнуў увагу нарады на недапушчальнасць таго, што транспартныя комсамольскія арганізацыі адарваліся ад тэрытарыяльных і што комсамол чыгункі зусім недастаткова займаецца вытворчымі пытаннямі.

На сходзе выступіў сакратар гаркома КП(б)Б тав. Власаў. Ён завастрыў увагу актыва на бліжэйшых задачах гарадской комсамольскай арганізацыі.

У спрэчках выступілі тт. Мальчэўскі, Доўнар, Чупрыс, Максімава, Шышкавец і іншыя. У прынятым рашэнні сход актыва намеціў практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню рашэнняў XVIII партканферэнцыі.

З вялікім уздымам сход комсамольскага актыва Мінска прыняў тэкст прывітальнай тэлеграмы правадыру народаў таварышу Сталіну.

# ЗА НОВЫЯ ПЕРАМОГІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА

### *Да ўсіх калгаснікаў, калгасніц, трактарыстаў і трактарыстак, камбайнераў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці*

### ЗВАРОТ НАРАДЫ ПАРТЫЙНАГА, СОВЕЦКАГА І КАЛГАСНАГА АКТЫВА МІНСКАЙ ОБЛАСЦІ

Таварышы! Мінулы, 1940 год адзначан новымі, найвялікшымі перамогамі соцыялізма ў нашай краіне. XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) паставіла перад краінай новыя грандыёзныя задачы. Народнагаспадарчы план 1941 года, прыняты канферэнцыяй, з'яўляецца праграмай далейшага ўмацавання нашай вялікай радзімы і росту яе несакрушальнай магутнасці.

Перад сацыялістычнай сельскай гаспадаркай пастаўлена задача велізарнай дзяржаўнай важнасці — павялічыць у 1941 годзе валавую прадукцыю зернавых на 8 проц. і сабраць не менш 7,9 мільярда пудоў зярна, значна павялічыць ураджайнасць тэхнічных культур і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі.

У 1940 годзе калгасы нашай вобласці значна ўмацаваліся, павысілася прадуктыўнасць працы, узрос матэрыяльны дабрабыт калгаснікаў. Многія калгасы, сотні брыгад і звенняў нашай вобласці сабралі ў мінулым годзе высокія ўраджаі зернавых, бульбы, гародніны і тэхнічных культур, значна павысілі прадуктыўнасць жывёлагадоўлі.

Калгасы «Маяк сацыялізма» Барысаўскага раёна, «Адраджэнне» і «Чырвоны партызан» Мінскага раёна атрымалі з усёй пасеўнай плошчы зернавых культур у сярэднім звыш 100 пудоў з гектара. Калгас «Шлях Ільіча» Старадарожскага раёна сабраў ураджай карэнняў кок-сагыза з плошчы ў 23 гектары па 31 цэнтнеру і ўраджай насення з двухгадовых плантацый па 91 кілограму з гектара, атрымаўшы ад пасеваў кок-сагыза грашовы даход у размеры 160 тыс. руб.

Брыгада калгаса «Май» Копыльскага раёна атрымала ўраджай махоркі з плошчы ў 7 гектараў па 40 цэнтнераў, а звяно калгаса імені Варашылава гэтага-ж раёна атрымала ўраджай махоркі па 50 цэнтнераў з гектара. Калгас «У з'езд Советаў» Барысаўскага раёна сабраў сярэдні ўраджай гародніны з плошчы ў 9 гектараў па 360 цэнтнераў, а ўраджай памідораў — па 400 цэнтнераў з гектара.

У калгасе «Чырвоны гаролнік» Мінскага раёна ўраджай сталовай морквы з асобных участкаў дасягнуў 815 цэнтнераў з гектара.

У 1940 годзе ў нашай вобласці сабран ураджай бульбы ў сярэднім па 135 цэнтнераў з гектара, а асобныя перадавыя калгасы і брыгады дасягнулі яшчэ больш высокіх ураджаяў. Так, напрыклад, калгас «1 мая» Слуцкага раёна атрымаў сярэдні ўраджай бульбы з плошчы ў 75 гектараў па 269 цэнтнераў. Калгас «Інтэрнацыянал» Уздзенскага раёна зняў ураджай бульбы з усёй плошчы пасева па 267 цэнтнераў з гектара.

Немалыя поспехі дасягнуты калгасамі нашай вобласці ў развіцці грамадскай жывёлагадоўлі. Выконваючы гістарычную пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах», усе калгасы вобласці арганізавалі фермы буйнай рагатай жывёлы. 1.842 калгасы маюць па тры жывёлагадоўчыя фермы і 119 калгасаў па 2 жывёлагадоўчыя фермы. У 1940 годзе ў калгасах арганізавана 1.296 птушкаферм.

Плячом к плячу з лепшымі перадавікамі сацыялістычнага земляробства ідуць стаханаўцы нашых калгасных ферм.

У калгасе «Чырвоны пуцілавец» Грэскага раёна даярка Елена Тышкевіч надаіла на кожную з 10 фуражных кароў па 3 тыс. літраў малака. У калгасе «1 мая» Слуцкага раёна Ольга Цыганова ад 5 свінаматак атрымала па 21,5 парасят на кожную свінаматку.

У калгасе «Пяцігодка» Пухавіцкага раёна аўчар Іван Рагалевіч ад 20 аўцаматак атрымаў прыплод 50 ягнят. Ад кожнай авечкі ён настрыг па тры кілограмы воўны. На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў мінулым годзе ад нашай вобласці было прадстаўлена 3.353 гаспадаркі, ферм і перадавікоў сельскай гаспадаркі. На выстаўку гэтага года ўжо зацверджана звыш 3,5 тыс. кандыдатаў.

Аднак у нашай вобласці яшчэ ёсць калгасы і раёны, дзе да гэтага часу нізкія ўраджаі і нізкая прадуктыўнасць жывёлагадоўлі.

Перадавікі сельскай гаспадаркі сваёй чэснай, самаадданай працай, прымяненнем перадавой агратэхнікі, клопатамі аб накапленні і правільным скарыстанні ўсіх відаў угнаенняў па-большэвіцку перамагаюць цяжкасці і капрызы прыроды, атрымліваюць у два-тры разы большыя ўраджаі і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі, чым калгасы, якія не змагаюцца за поўнае прымяненне перадавой агратэхнікі, не клапоцяцца аб накапленні і правільным скарыстанні ўсіх відаў угнаенняў, а разлічваюць на міласць прыроды.

Адстаючым калгасам і раёнам трэба сур'ёзна ўзяцца за павышэнне ўраджайнасці і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, не чакаць міласці ад прыроды, а чэснай, самаадданай працай, прымяненнем перадавой навукі і вопыту перадавікоў сацыялістычнага земляробства узяць ад зямлі ўсё, што яна толькі можа даць.

Мы павінны поўнасцю скарыстаць усе рэзервы, якія тоіць у сабе наша сацыялістычнае земляробства.

Мы штодзённа адчуваем сталінскія клопаты аб калгасным ладзе. Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб змяненнях у палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў і ўстанаўленні пагектарнага вылічэння абавязковых паставак аказала рашаючы ўплыў на развіццё ўсіх галін сацыяльнай гаспадаркі.

1941 год азнаменаваўся новым праяўленнем сталінскіх клопатаў аб далейшым росквіце калгаснага ладу, аб далейшым палепшанні жыцця і добрабыту калгаснікаў.

Партыя і ўрад прынялі рашэнне «Аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі па Беларускай ССР».

Закон гэты — велізарнай дзейснай сілы. У ім выражаны інтарэсы дзяржавы, калгасаў і ўсіх калгаснікаў.

Новы сталінскі закон ліквідуе існаваўшую несправядлівасць у аплаце працы ў калгасах, заахвочвае перадавых людзей калгаснай вёскі. Па ранейшай сістэме аплаты працы выходзіла так, што добра працаваўшыя калгаснікі атрымлівалі на працадзень нараўне з тымі, якія не змагаліся па-сапраўднаму за павышэнне ўраджаю і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі.

Напрыклад, калгаснікі брыгады тав. Барысіка з калгаса «Чырвоны Міхейкі» Слуцкага раёна ў 1940 годзе сабралі сярэдні ўраджай зернавых па 17,3 цэнтнера і ўраджай бульбы па 250 цэнтнераў з гектара, а калгаснікі брыгады тав. Бадыля з такой-жа плошчы атрымалі ўраджай зернавых па 10,8 цэнтнера з гектара і бульбы па 195 цэнтнераў з гектара. Аднак не гледзячы на тое, што брыгада тав. Барысіка атрымала ўраджай зярна большы на 6,5 цэнтнера з гектара і затраціла на 1.474 працадні менш, чым брыгада тав. Бадыля, — калгаснікі брыгады тав. Барысіка пры аднолькавай аплаце працадня атрымалі за работу менш, чым калгаснікі брыгады тав. Бадыля.

Калгаснікі брыгады тав. Івановіча з калгаса «Чырвоны гаролнік» Мінскага раёна атрымалі ўраджай бульбы па 203,1 цэнтнера з гектара, затраціўшы на адзін гектар па 80 працадзён, а брыгада тав. Анцілеўскага атрымала ўраджай па 153,1 цэнтнера з гектара, затраціўшы па 87 працадзён на адзін гектар. Пры аднолькавай выдачы на працадзень калгаснікі брыгады тав. Івановіча, сабраўшыя больш высокі ўраджай, атрымалі за работу менш, чым калгаснікі брыгады тав. Анцілеўскага.

Цяпер гэтаму не бывань. Хто добра працуе, той больш і атрымае.

Вось чаму калгаснікі з такім гарачым адабрэннем сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі па Беларускай ССР».

Гэта мудрае рашэнне партыі і ўрада з'яўляецца новым найярчэйшым сведчаннем штодзённых клопатаў нашай партыі Леніна—Сталіна, совецкага ўрада і асабіста правадыра народаў таварыша Сталіна аб росквіце калгасаў, аб заможным жыцці калгаснікаў.

Пастанова партыі і ўрада з'яўляецца найвялікшым стымулам для павышэння ўраджайнасці калгасных палёў і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, для ўсебаковага развіцця арцельнай гаспадаркі.

Што атрымаюць перадавыя калгаснікі на аснове пастановы партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы, можна бачыць з наступных прыкладаў.

Вось брыгада т. Якубовіча С. з калгаса «Адраджэнне» Мінскага раёна. У мінулым годзе яна атрымала з плошчы ў 68 гектараў па 16.8 цэнтнера зернавых, пры планавай ураджайнасці ў 12 цэнтнераў з гектара. З усёй пасеўнай плошчы брыгада сабрала звыш плана 326,4 цэнтнера зярна. Калгаснікі брыгады тав. Якубовіча маглі-б атрымаць у парадку дадатковай аплаты $^1/_3$ прадукцыі, атрыманай звыш плана, або 108,4 цэнтнера зернавых культур.

Свінарка калгаса «Камбайн» Слуцкага раёна Акуліна Семяновіч у мінулым годзе ад 5 свінаматак атрымала 23,4 парасят ад кожнай свінаматкі, пры планавым заданні ў 19 парасят.

Звыш плана тав. Семяновіч атрымала 27 парасят. Яна магла-б атрымаць дадатковую аплату — 5 парасят.

Даярка калгаса імені Калініна Пухавіцкага раёна Марфа Надольская ад 15 замацаваных за ёю кароў надаіла па 2.012 літраў малака на кожную фуражную карову, пры плане ў 1.480 літраў.

Тав. Надольская атрымала-б дадатковa 1.197 літраў малака ў асабістае карыстанне.

Соўнарком БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі ўстанавілі для нашай вобласці на 1941 год план сярэдняй ураджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

У гэтым годзе мы павінны атрымаць не менш:

11 цэнтнераў усіх зернавых з кожнага гектара,
11,7 цэнтнера азімай пшаніцы,
11,9 цэнтнера азімага жыта,
10,8 цэнтнера яравой пшаніцы,
11 цэнтнераў ячменю,
10,4 цэнтнера аўса,
12 цэнтнераў проса,
7 цэнтнераў грэчкі,
10,2 цэнтнера бабовых культур,
8,3 цэнтнера вікі на насенне,
3,5 цэнтнера ільновалакна,
2,9 цэнтнера ільносемя,
4,4 цэнтнера валакна сярэдне-рускіх канапель,
4 цэнтнеры насення канапель,
14,1 цэнтнера махоркі,
140 цэнтнераў бульбы,
150 цэнтнераў позняй капусты,
120 цэнтнераў памідораў,
120 цэнтнераў гуркоў,
140 цэнтнераў сталовых буракоў,
60 цэнтнераў цыбулі,
1,3 цэнтнера насення канюшыны,
1,6 цэнтнера цімафееўкі,
1.290 літраў малака на адну фуражную карову,
2,4 кілограма настрыгу воўны з адной авечкі,
120 ягнят на сто аўцаматак,
85 цялят на сто кароў і нецелей.

Вопыт перадавых калгасаў і асобных перадавікоў сельскай гаспадаркі паказвае, што ўстаноўленыя нашай вобласці заданні з'яўляюцца мінімальнымі і яны могуць быць значна перавыкананы.

Мы заклікаем вас, таварышы калгаснікі, калгаснікі, трактарысты і трактарысткі, камбайнеры і спецыялісты сельскай гаспадаркі, па-большэвіцку змагацца за перавыкананне задання партыі і ўрада.

На перавыкананне ўстаноўленых заданняў накіруем усе нашы сілы, усю энергію, скарыстаем усе рэзервы.

Мы знаходзімся напярэдадні адказнейшага этапа сельскагаспадарчых работ — веснавой сяўбы. Паспяховае правядзенне веснавой сяўбы ў значнай ступені будзе рашаць высокі ўраджай гэтага года.

Наша задача зараз заключаецца ў тым, каб поўнасцю і ў кожным калгасе завяршыць усе падрыхтоўчыя работы да сяўбы.

Не трацячы ні аднаго дня, неабходна ў кожным калгасе закончыць расстаноўку вытворчых і рабочых планаў, прадумледзеўшы ў іх правільную расстаноўку людзей і скарыстанне машын, коней, інвентара.

Правільна арганізаваць працу калгаснікаў, арганізаваць пастаянныя вытворчыя звенні і замацаваць за імі пасевы тэхнічных і гародных культур. Кіраўніцтва звеннямі трэба даручыць лепшым людзям калгаснай вёскі. Кожны калгаснік павінен ведаць, за які ўраджай трэба змагацца, каб атрымаць дадатковую аплату за перавыкананне планаў. Трэба правільна паставіць улік працы па брыгадах і звеннях.

Таварышы старшыні калгасаў і брыгадзіры! Вам калгаснікі даверылі кіраўніцтва грамадскай гаспадаркай, ад вас у многім залежыць правільная арганізацыя калгаснай вытворчасці і дасягненне высокіх ураджаеў. З чэсцю апраўдайце гэта высокае давер'е!

Наша задача правесці веснавую сяўбу дружна, арганізавана, у максімальна сціслыя тэрміны, на высокім агратэхнічным узроўні. У кожным калгасе павінна быць неадкладна закончана падрыхтоўка насення да сяўбы, праведзен сортаабмен, закончана ачыстка насення. У гэтым годзе трэба шырэй прымяніць яравізацыю насеннага матэрыяла і поўнасцю скарыстаць усе сеялкі для выканання і перавыканання плана ралковай сяўбы зернавых, ільну і кок-сагыза.

Своечасова павінны быць падрыхтаваны машыны, сельскагаспадарчы інвентар, завезена неабходная колькасць хімікатаў для пратручвання насення. Трэба накіраваць нашы намаганні на максімальнае накапленне ўсіх відаў угнаенняў, скарыстанне ўсіх рэзерваў мясцовых угнаенняў і рашуча пакончыць з практыкай безгаспадарчых адносін да скарыстання ўгнаенняў.

Мы заклікаем усіх калгаснікаў шырока ўнядрыць у калгасную вытворчасць багаты вопыт перадавікоў — удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Ва ўсіх калгасах нашай вобласці ўведзены правільныя севазвароты. Наша задача заключаецца ў тым, каб поўнасцю іх асвоіць, прымяніць увесь комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў, намечаных севазваротам. Асаблівую ўвагу ўдзяліць насенневодству канюшыны, як рашаючаму фактару асваення правільных севазваротаў.

Партыя і ўрад звяртаюць нашу ўвагу на расшырэнне пасеваў і палянае ўраджайнасці кок-сагыза. Бурна развіваючаяся прамысловасць, інтарэсы ўсёй народнай гаспадаркі і абароны нашай краіны патрабуюць усямернага павелічэння вытворчасці каучука.

Партыяй і ўрадам створаны ўсе ўмовы для паспяховай вытворчасці каучука.

Нашай задачай з'яўляецца — перавыканаць план сяўбы кок-сагыза ў калгасах, сеяць кок-сагыз на прысядзібных участках калгаснікаў, не дапусціць гібелі ні аднаго гектара пасеваў гэтай каштоўнейшай культуры і дабіцца высокіх і ўстойлівых ураджаяў кок-сагыза.

З найвялікшым энтузіязмам калгаснікі нашай вобласці, як і ўвесь беларускі народ, сустрэлі гістарычную пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей». Гэтай пастановай намечан грандыёзны план работ па ператварэнню беларускіх балот, якія з'яўляліся раней крыніцай галечы, хвароб і бесплоднасці, — у квітнеючыя, высокаўраджайныя калгасныя палі — крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў.

Гэта пастанова яшчэ раз сведчыць аб велізарных клопатах нашай партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна аб беларускім народзе, аб працвітанні калгасаў, росце заможнасці калгаснага сялянства.

У 1940 годзе калгасы нашай вобласці, па ініцыятыве любаньскіх калгаснікаў, шырока разгарнулі работы па асушэнні балот, у рэзультаце чаго за адзін толькі год было асушана 14.813 гектараў. Усяго за апошнія годы ў нашай вобласці ўжо асушана 35.667 гектараў балотных зямель, з якіх асвоена 24.062 гектары. У адным толькі Любаньскім раёне за гэты час асушана 15.878 гектараў балот, з якіх асвоен 12.661 гектар. Усе мы добра ведаем, якія выдатныя ўраджаі атрымліваюць калгаснікі нашай вобласці на асушаных балотных землях. Яны ў 2—3 разы перавышаюць ураджаі, атрымліваемыя з мінеральных зямель. Калгас імені Беларускай Асобай Ваеннай Акругі Любаньскага раёна на асушаных балотных землях за апошнія 3 годы атрымаў у сярэднім ураджай зернавых — 15 цэнтнераў з гектара, канапель-саломкі — 42 цэнтнеры і сена многалетніх траў — 40 цэнтнераў з гектара. Калгас «Чырвоны Кастрычнік» Любаньскага раёна атрымаў ураджай ячменю па 18 цэнтнераў, проса па 24 цэнтнеры, карэнняў кок-сагыза па 40 цэнтнераў і бульбы па 200 цэнтнераў з гектара.

Калгас імені Сталіна Мінскага раёна сабраў сярэдні ўраджай сеяных траў з плошчы ў 142 гектары па 50 цэнтнераў і ўраджай ячменю з плошчы ў 43 гектары па 24 цэнтнеры з гектара.

У 1941 годзе перад намі стаіць вялікая і сур'ёзная задача — асушыць у нашай вобласці не менш 17 тысяч гектараў балот і асвоіць пад пахаць і сенажаці 18 тысяч гектараў балотных зямель. Гэта заданне мы лічым мінімальным. Мы прымем усе меры да таго, каб яго значна перавыканаць. Для гэтага неабходна своечасова правесці ўсе падрыхтоўчыя мерапрыемствы — падрыхтаваць поўнасцю неабходныя інструменты і матэрыялы, распрацаваць у кожным калгасе падрабязныя планы меліяратыўных работ.

Кожнай палявочай брыгадзе адвесці ўчасткі для правядзення работ, на аснове шырокага спаборніцтва забяспечыць масавы выхад калгаснікаў і высокую прадукцыйнасць працы на асушэнні балот.

Таварышы калгаснікі, работнікі жывёлагадоўчых ферм, зоатэхнікі і ветэрынарныя работнікі! Вы працуеце на адказнейшым участку сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Змагайцеся па-большэвіцку за высокую прадуктыўнасць грамадскай жывёлагадоўлі, за поўнае захаванне маладняка, за высокія тэмпы росту пагалоўя грамадскай жывёлы ў калгасах, за стварэнне моцнай кармавой базы, упадрайце вопыт стаханаўцаў жывёлагадоўлі.

Партыя і ўрад узброілі сельскую гаспадарку нашай вобласці перадавой машынай тэхнікай. Мы звяртаемся да вас, таварышы трактарысты, камбайнеры, ільноцерабільшчыкі, рабочыя МТС, — поўнасцю скарыстайце магутную сацыялістычную тэхніку ў барацьбе за высокія ўраджаі ўсіх культур.

Узорна завершым падрыхтоўку ўсіх сельскагаспадарчых машын да веснавой сяўбы, будзем змагацца за поўнае і высокаякаснае выкананне і перавыкананне дзяржаўных планаў, за эканомнае расходаванне гаручага і змазачнага, будзем беражна і эканомна адносіцца да дзяржаўнай і калгаснай маемасці.

Мы заклікаем вас, старшынь калгасаў, брыгадзіраў, звеньевых, калгаснікаў і калгасніц, работнікаў зямельных органаў і МТС і ўсіх спецыялістаў сельскай гаспадаркі, шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за атрыманне ў 1941 годзе высокіх ураджаяў усіх сельскагаспадарчых культур, высокай прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, за перавыкананне планаў асушэння і асваення балот, за паспяховае выкананне ўсіх задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад сельскай гаспадаркай нашай вобласці.

Дадзім нашай краіне больш хлеба, бульбы, кок-сагыза, ільну, мяса, малака, воўны, яшчэ больш умацуем нашы калгасы, зробім жыццё калгаснікаў яшчэ больш заможным, культурным і радасным.

Зробім 1941 сельскагаспадарчы год годам новых слаўных перамог нашай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Няхай жыве наша сацыялістычная радзіма!

Няхай жыве наш родны Совецкі ўрад!

Няхай жыве наша вялікая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве наш любімы, родны бацька, вялікі настаўнік і друг калгаснікаў — Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

## Перадавікі сацыялістычнага спаборніцтва лясной прамысловасці БССР

Учора ў Паркамаце лясной прамысловасці БССР адбылося чарговае пасяджэнне журы. Падведзены вынікі ўсебеларускага сацыялістычнага спаборніцтва лесарубаў і возчыкаў за люты месяц 1941 года. Сярод трэстаў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве заняў вілейскі трэст (упраўляючы т. Лучнік, галоўны інжынер т. Бакштаеў), які план па загатоўцы лесу за люты месяц выканаў на 125,8 проц. і па вывазцы на 115,8 проц. Трэст датэрмінова завяршыў квартальнае заданне па асноўных асартыментах. Тут шырока разгорнут стаханаўскі рух, узякоючы чаму ўсе леспрамгасы датэрмінова выканалі квартальны план.

Адзначаючы добрую работу трэста, журы пастанавіла: **перадаць трэсту «Вілейлеспром» пераходны чырвоны сцяг Наркомлеса БССР і БРК саюза лесу і сплава і першую грашовую прэмію ў суме 10 тысяч рублёў на прэміраванне лепшых стаханаўцаў лесарубаў і возчыкаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў.**

**Другая грашовая прэмія ў суме 7 тысяч рублёў і пераходны чырвоны сцяг Наркомлеса БССР і БРК саюза лесу і сплава прысуджаны Іванаўскаму мехпункту** трэста Мінлеспром (начальнік мехпункта тав. **Мерхасін**, старшыня РК саюза т. Ржэвуцкі). Мехпункт датэрмінова выканаў квартальны план як па вывазцы, так і па загатоўках лесу.

**Трэцяя грашовая прэмія** ў суме 5 тысяч рублёў прысуджана Аўгустоўскаму леспрамгасу трэста Беластокленсром (дырэктар леспрамгаса т. Алінак). Леспрамгас выканаў план за люты месяц па загатоўках на 131,5 проц., па вывазцы — на 129 проц.

**Першае месца** ў спаборніцтве звенняў заваявала звяно лесарубаў Брожскага мехпункта тав. Лавіцкага Івана. Лесарубы гэтага звяна выканалі сваё заданне за люты на 321 проц., за што **атрымалі першую прэмію** ў суме 1.500 рублёў.

**Дзве другія прэміі** ў суме па тысячы рублёў кожная прысуджаны звенням тт. Зіновенкі Уладзімера (Асіпавіцкі леспромгас) і т. Брылевіча Фёдара (Лельчыцкі леспрамгас).

Сярод возчыкаў пяршынства ў спаборніцтве заняло звяно тав. Грынько (Асіпавіцкі леспрамгас). Месячнае заданне звяно выканала на 201 проц. Звяну прысуджана першая прэмія ў суме 1.500 рублёў.

**Другую прэмію** сумай у т

*Партыйнае жыццё*

# РАШЭННЕ ПАРТЫЙНАГА СХОДА НЕ ВЫКАНАНА

17 лютага на віцебскім станкабудаўнічым заводзе імені Кірава адбыўся адкрыты партыйны сход. Абмяркоўваўся даклад тав. Маленкова на XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б). Пераважная большасць выступаўшых таварышоў канцентравала ўвагу калектыва завода па неабходнасці навядзення чыстаты і парадку ў цэхах і на заводскім двары.

У вынесеным партыйным сходам рашэнні быў запісан спецыяльны пункт аб навядзенні чысгаты і парадку на заводзе.

Прайшоў месяц. Разам з сакратаром Першамайскага райкома партыі т. Лондан і дырэктарам завода т. Слёзбергам мы абышлі цэхі і ўчасткі завода.

Заходзім у механічны цэх.

— Алсюль,—гаворыць нам тав. Слёзберг, — мы вывезлі звыш 10 тон усякага хламу. І сапраўды, у цэху стала прастарней, свяжай. Лепш утрымліваюцца рабочыя месцы і інструмент. Але за прайшоўшы час можна было правесці значна большую работу. Належнага парадку і чыстаты ў механічным цэху, як і ва ўсім заводзе, яшчэ няма.

Вось перад намі круглашліфавальны станок. Відаць, яго ўжо даўно не чысцілі. Тоўстым слоем пылу пакрыта ўся яго паверхня. Або прадольна-стругальны станок. Від у яго таксама непрыглядны. Па ўсяму станку раскіданы металічныя стружкі, а вакол яго валяюцца балты, кавалкі жалеза і розныя прыстасаванні. Гэты станок наогул дрэнна скарыстоўваецца.

Нямала бракаваных дэталей валяецца і ля іншых станкоў. Ля свідравальнага станка, на якім працуе т. Фільчанка, у беспарадку ляжыць каля 100 бракаваных чыгунных дэталей. Гэта брак ліцейнага цэха, і толькі з-за недагляду кантрольнага апарата ён папаў у механічны цэх для свідравання. Зараз гэтыя бракаваныя дэталі ляжаць ля станка і перашкаджаюць у працы.

Фрэзеровшчык-многастаночнік член партыі т. Бірукоў гаворыць:

— Зубафрэзерны станок, на якім я зараз працую, пастаўлен тут нядаўна. Пры ўстаноўцы фундамента пакрывілася падлога, але яе не адрамантавалі. Падлога, як бачыце, уся дзіравая, ходзіш і спатыкаешся. А гэта-ж адмоўна адбіваецца на маёй рабоце.

Многа бескультур'я мы ўбачылі і ў зборачным цэху. Ля новага заточнага станка валяўся няспраўны матор. Яго даўно спісалі па акту, а з цэха не ўбралі. У канцы цэха, у куту, разам са смецем, ляжала некалькі дзесяткаў сталоў да заводачных станкоў. Сцены і вокны брудныя, са столі пячэ. На сцяне, на самым відным месцы вісела паліто. Рабочы-шаброўшчык т. Цыхош сваё паліто паклаў у яшчык разам з інструментамі, а ў цэху-ж ёсць раздзявалка.

Яшчэ горш выглядае загатоўча-кузнечны цэх. Ля наждачнага станка ў беспарадку валяюцца сотні дэталей. Прыгодныя дэталі змяшаліся з бракаванымі, зараслі пылам і брудам. Гаспадарскае вока сюды даўно не заглядвала.

Пайшлі на заводскі двор. Ён увесь заграмаджан тысячамі дэталей. Ля перапоўненай смецпем скрыні, сярод усякага хламу, бракаваных вырабаў і гор заіржавеўшай стружкі, валяюцца нядаўна зробленыя дэталі да цялег, а таксама станіны да станкоў, адлітых для ленінградскага завода «Ільіч».

Ля ўваходу ў зборачны цэх у снягу ляжыць каля 50 камплектаў кручкоў, ланцугоў, каромыслаў і іншых кованых і наразных частак да тарфяных цяльжак, зробленых для Наркамата паліўнай прамысловасці, а таксама сталы і гарлавіны для заточных станкоў, адлітых па заказу таго-ж ленінградскага завода. Усе гэтыя каштоўныя дэталі былі зроблены яшчэ ў кастрычніку—снежні мінулага года і па сёння ляжаць у снягу, іржавеюць і прыходзяць у непрыгоднасць.

Пад адкрытым небам таксама валяюцца фармовачныя апокі, радыятары для паравога апалення, станкі рознага тыпу як вышэйшыя з вытворчасці, так і дэмантываныя. Наогул, двор ператварыўся ў звалку гатовых і бракаваных вырабаў.

Рашэнне партыйнага схода аб навядзенні парадку і чыстаты рэалізуецца вельмі дрэнна. Станкабудаўнічы завод імені Кірава па сёння знаходзіцца ў стане бескультур'я, захламленасці. Гэта зусім не да твару аснашчонаму першакласным абсталяваннем прадпрыемству.

Мала выносіць рашэнні, іх трэба выконваць. На жаль, партбюро завода (сакратар партбюро т. Рохлін) яшчэ слаба кантралёўвае дзейнасць адміністрацыі, не правярае выканання важнейшых партыйных рашэнняў. Між тым, захламленасць завода, адсутнасць культуры ў арганізацыі працы адмоўна ўплывае на выкананне якасных паказальнікаў промфінплана.

Зрыў графіка па вырабу асноўнай прадукцыі — станкоў, нарушэнні тэхналагічнай дысцыпліны, вялікі процант браку — усё гэта яшчэ і па сёння мае месца на віцебскім станкабудаўнічым заводзе імені Кірава.

**З. ЛАРЫСАЎ.**

## Эканамічная вучоба кіруючага актыва прадпрыемстваў

Гэтымі днямі пачынаюць эканамічную вучобу кіруючыя партыйна-гаспадарчыя работнікі фабрыкі «Комунарка», завода «Чырвоная зара» і раду іншых прадпрыемстваў Сталінскага раёна г. Мінска. Гэта — другая група прадпрыемстваў раёна, на якіх арганізуецца эканамічная асвета. На заводах імені Варашылава, імені Кірава і «Большэвік» такая вучоба праводзіцца ўжо другі месяц. Дырэктары прадпрыемстваў, іх намеснікі, галоўныя інжынеры, загадчыкі аддзелаў, начальнікі цэхаў, майстры па выхадных днях рэгулярна, тры разы ў месяц праходзяць вучобу па паўнай праграме.

На заводзе імені Варашылава семінарскія заняткі наведвае 41 чалавек. У вучэбную праграму ўваходзяць наступныя тэмы: «План прадпрыемства, яго структура», «Аналіз гаспадарчай дзейнасці завода на прыкладзе справаздачы 1940 г.», «Вытворчая праграма і яе вымяральнікі», «Тэхнічнае нарміраванне» і іншыя.

Уся вучоба будуецца на глыбокай сувязі тэорыі з практыкай. Заняткі праводзяць кваліфікаваныя выкладчыкі інстытутаў і спецыялісты прадпрыемстваў; сярод іх—выкладчык па эканоміцы і планіраванню, дацэнт інстытута народнай гаспадаркі тав. Аксельрод, выкладчык тэхналогіі метала таго-ж інстытута тав. Сульскі, начальнік планавага аддзела завода тав. Кроль і іншыя.

Зараз арганізуецца раённы семінар для камандзнага састава дробных прадпрыемстваў. Заняткі міркуецца праводзіць два разы ў месяц. У праграму заняткаў уключаны тэмы: «Вынікі XVIII партканферэнцыі і задачы кіруючых работнікаў прадпрыемстваў». «Асноўныя закономернасці развіцця народнай гаспадаркі СССР». «Роля майстра, начальніка цэха на заводзе», «Учот вытворчасці і калькуляцыя сабекошту прадукцыі», «Арганізацыя гаспадарчага разліку на прадпрыемстве, у цэху» і рад іншых вытворчых пытанняў.

З пачаткам заняткаў гэтай групы прадпрыемстваў эканамічнай вучобай па раёну будзе ахоплена 275 кіруючых партыйна-гаспадарчых работнікаў.

# Сутачны графік—аснова зладжанай работы прадпрыемстваў

СССР — адзіная ў свеце краіна планавай гаспадаркі, адзіная краіна, у якой створаны ўсе ўмовы для арганізацыі па алзінаму плану грамадскага працэса вытворчасці.

Соцыялістычны план на практыцы паказаў сваю сілу. Аб гэтым наглядна гаворыць поспехі планавай соцыялістычнай гаспадаркі СССР, аб гэтым гаворыць паспяховае ажыццяўленне сталінскіх пяцігодак. «Працаваць па плану — значыць ведаць, што трэба рабіць і для якой мэты. Планы ператварыліся ў нашай краіне ў незамянімую арганізуючую сілу. Таму выконваць прыняты план стала справай чэсці працоўных СССР» (В. М. Молатаў, Даклад на XVIII з'ездзе ВКП(б).

У нас ёсць усе магчымасці працаваць планамерна, рытмічна, культурна. Аднак, на асобных прадпрыемствах у большасці выпадкаў не звярталі ўвагі на неабходнасць рытмічнай работы, пераводу выпуску ўсёй таварнай прадукцыі на цвёрды сутачны графік.

Для ўнядрэння сутачнага графіка асаблівае значэнне маюць два тэзісы:

Па-першае. «Складанне плана ёсць толькі **пачатак планіравання.** Сапраўднае планавае кіраўніцтва разгортваецца пасля складання плана, пасля праверкі на месцах, у ходзе ажыццяўлення і ўдакладнення плана» (Сталін, «Пытанні ленінізма», вып. X, стар. 413).

Па-другое. «У аснову правільнай арганізацыі працы і ўнутрызаводскага планіравання павінна быць пакладзена тэхнічнае нарміраванне» (з рэзалюцыі XVII партканферэнцыі ВКП(б) па дакладу тав. Орджанікідзе).

Кожны працуючы ў галіне ўнутрызаводскага планіравання павінен ператварыць гэтыя тэзісы ў праграму сваіх дзеянняў.

Асноўная задача — ліквідацыя абязлічкі на шляху прасоўвання (руху) прадукцыі. Сродкам для ліквідацыі абязлічкі ў руху прадукцыі ад цэха да цэха, ад станка да станка павінна быць тэхнічнае нарміраванне гэтага руху. Гэтага можна было-б не падкрэсліваць, калі-б на практыцы мы не сутыкаліся з прамым адмаўленнем неабходнасці нарміравання руху прадукцыі або з недаацэнкай гэтай неабходнасці. Кожны элемент вытворчага працэса мае свае нормы. Унутрызаводскае і цэхавае планіраванне ў цэлым мае таксама сваю норму, норму руху прадукцыі на ўсіх аперацыях і пераходах, нормы вытворчага цыкла і незавершанай вытворчасці.

Гэтыя нормы не новыя, планавыя аддзелы заўсёды разлічваюць і вытворчы цыкл, і незавершаную вытворчасць. У тэхнічным промфінплане прадпрыемства і цэха таксама ёсць гэтыя разлікі. Але сутнасць заключаецца ў тым, што пасля складання вытворчага цыкла і разлікаў незавершанай вытворчасці аб гэтых нормах забываюць, у сувязі з чым яны не з'яўляюцца зброяй ліквідацыі абязлічкі ў прасоўванні прадукцыі ад цэха да цэха, ад станка да станка. У рэзультаце распе незавершаная вытворчасць, а на некаторых прадпрыемствах стваральна горы выробленых поўфабрыкатаў, не патрэбных па сёння і на бліжэйшы час, прадстаўляючых сабой «запас», абумоўлены бясплановасцю. Гэта не толькі амярцвлёныя сродкі, але і амярцвлёныя дэфіцытныя матэрыялы, у якіх заўтра-паслязаўтра будзе мець патрэбу яки-небудзь іншы цэх.

Асноўная ўмова паспяховага ўнядрэння сутачных графікаў заключаецца перш за ўсё ў палнаце на належную вышэйшую ўзроўню тэхнічнага нарміравання. Тэхнічнае нарміраванне ў радзе выпадкаў паглыбляе праектыровачі тэхнолага, прымушае забіваца іх найбольшай эканамічнасці з пункту гледжання затрат рабочага часу. Тэхнічнае нарміраванне пры правільнай яго пастаноўцы з'яўляецца лепшым метадам выяўлення непрадукцыйных затрат, непатрэбных рухаў і вузкіх месц вытворчасці. Карэннае палепшанне нарміравання працы з'яўляецца адной з неабходных умоў падняцця ўзроўню планіравання да ўзроўню велізарных палітычных і гаспадарчых задач 1941 года.

Другой умовай роўнамернага, рытмічнага выканання плана з'яўляецца распрацоўка канкрэтнай, разгорнутай тэхналогіі.

Навесці парадак у тэхналогіі — гэта значыць тэхнічна пісьменна скласці пааперацыйныя тэхналагічныя карты, дакументываваць усе працэсы, азнаёміць з імі сярэднія і ніжэйшыя камандныя вытворчыя кадры, дабіцца таго, каб рабочы не пачынаў работы да таго часу, пакуль майстар або наладчык не азнаёміць яго дэтальна з тэхналагічным законам, з правіламі вырабу або апрацоўкі дэталі, агрэгата і т. п.

«Нельга, — гаворыць таварыш Сталін, —тэхніку адрываць ад людзей, якія прыводзяць тэхніку ў рух. Тэхніка без людзей мёртвая».

Трэцяя ўмова забеспячэння зладжанай, рытмічнай работы — гэта ўвядзенне арганізацыйнага плана.

Сутнасць яго заключаецца ва ўстанаўленні схемы вытворчага патоку ў прасторы; устанаўленні вытворчага цыкла ў днях і гадзінах; у выяўленні ўсіх вытворчых пераходаў і міжаперацыйных перапынкаў; ва ўстанаўленні графіка руху поўфабрыката, паказваючага, на якім станку знаходзіцца ў даны момант сыравіна і поўфабрыкаты.

Асноўная задача арганізацыйнага плана: зафіксіраваць шлях, які павінен прайсці поўфабрыкат; зафіксіраваць час гэтага шляху па кожнай аперацыі і брыгадзе ў паасобку; прасачыць гэты шлях і выявіць яго дэфекты; распрацаваць мерапрыемствы, якія-б ліквідавалі гэтыя недахопы.

Такім чынам у задачу арганізацыйнага плана ўваходзіць — размясціць у межах аб'ёму вытворчасці апрацоўку асобных відаў сыравіны і поўфабрыкатаў, каб яны паступалі ва ўстаноўлены час, каб кожная аперацыя пачыналася і канчалася ў назначаны для яе час, каб уся ёмкасць цэха была поўнасцю скарыстана, каб асобныя віды сыравіны і поўфабрыкатаў на ўсіх стадыях не перашкаджалі адзін аднаму.

Унядрэнне арганізацыйнага плана патрабуе папярэдняй глыбокай і дакладнай прапрацоўкі ўсіх элементаў, з якіх ён складаецца. Узбраенне арганізацыйным планам дае цэху магчымасць (у межах залежачых ад яго ўмоў работы) рэгуляваць рух вытворчага патоку. Аднак ёсць такія знешнія ўмовы, якія ўплываюць на распарадак і роўнамернасць работы цэха. Да гэтых умоў у першую чаргу адносіцца забеспячэнне цэха сыравінай, дапаможнымі матэрыяламі, палівам, парам, энергіяй і т. д. Для таго каб цэхі мелі ўпаўнепасць у тым, што вытворчасць будзе своечасова забяспечана сыравінай, матэрыяламі, палівам, будуецца арганізацыйна забеспячэння ў календарным разрэзе, з дакладным пералікам выканаўцаў.

Пабудова арганізацыйнага плана забеспячэння нескладаная: у аснову яго павінны быць пакладзены нормы расходаў, устаноўленыя метадыкай вытворчасці, і час работы транспарта, капельных установак і т. д. Апрача прыведзеных графікаў павінны быць складзены графікі плана-папераджальнага рамонту, уліку астаткаў сыравіны і матэрыялаў на складзе і т. д.

Многія прадпрыемствы не складаюць сутачных і гадзінных графікаў, якія-б адпавядалі ўстаноўленай методыцы апрацоўкі сыравіны. Адсутнасць сутачнага графіка прыводзіць да штурмаўшчыны, зрыву высокапрадукцыйнай работы, да аслаблення тэхналагічнай дысцыпліны, неабходнай для выпуску прадукцыі высокай якасці.

Тав. Маленкоў у сваім дакладзе на XVIII партыйнай канферэнцыі ілюстрыраваў гэта многімі прыкладамі з практыкі машынабудаўнічай прамысловасці Маскоўскай вобласці, г. Масквы і Ленінграда. Вопыт мінскіх заводаў — станкабудаўнічага завода імені Кірава, станкабудаўнічага завода імені Варашылава, металазавода імені Чкалава і іншых—наглядна паказвае, да чаго даводзіць адсутнасць сутачнага графіка.

Вось табліца, якая ярка адлюстроўвае няроўнамернасць выпуску прадукцыі:

| | У сярэднім за 1940 г. | | | Студзень | | | Люты | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | У процантах да месячнага плана | | | | | | | | |
| | 1-я дэкада | 2-я дэкада | 3-я дэкада | 1-я дэкада | 2-я дэкада | 3-я дэкада | 1-я дэкада | 2-я дэкада | 3-я дэкада |
| Станкабудаўнічы завод імені Кірава | 6,3 | 20,4 | 73,3 | 4,8 | 5,2 | 88,3 | 3,4 | 37,0 | 61,9 |
| Станкабудаўнічы завод імені Варашылава | — | — | — | 7,0 | 20,0 | 25,0 | 27,0 | 41,0 | 46,0 |
| Металазавод імені Чкалава | — | — | — | 23,4 | 32,4 | 44,7 | 29,7 | 30,5 | 41,6 |

Няроўнамернасць выпуску прадукцыі на станкабудаўнічым заводзе імені Кірава з'яўляецца не выпадковай, а выцякае з усёй сістэмы арганізацыі вытворчасці. Няроўнамернае выкананне плана выклікае пізкім узроўнем нарміравання, адсутнасцю распрацаваных вытворчых цыклаў зборкі, графіка руху дэталей у механічным і зборачным цэхах. На заводзе амаль усе нормы — вопытна-статыстычныя, апрача таго, там няма раздзялення па класіфікацыі часу: падрыхтоўчы, заключны, асноўны і т. д.

Існуючы ў механічным цэху графік выпрацоўкі і прапагандзінах паказвае толькі адхіленні ад ступені выканання плана ў працагадзінах, а не рух дэталей па асобных аперацыях з пункту гледжання іх камплектнасці.

Існуючы графік становішча камплектажа як у дыспетчарскім аддзеле, так і ў механічным цэху фіксіруе толькі лік вырабленых дэталей, прайшоўшых праз кладовую ў зборачны цэх да канца вытворчага цыкла.

Такі графік не руху, а стану камплектажа не можа забяспечыць своечасовую камплектнасць прадукцыі. Паяснім гэта на прыкладзе. Заказ № 5 прадугледжвае выпуск партыі ў 20 станкоў; вытворчы цыкл, г. зн. перыяд часу, на працягу якога апрацоўваецца гэта партыя ў механічным цэху, арыентыровачна ў некалькі тысяч дэталей, прадаўжаецца 20 дзён, механічны-ж цэх штодзённа здае ў кладовую толькі 50—100 дэталей. Графік стана паказвае толькі гатоўнасць гэтых 50—100 дэталей да здачы ў зборачны цэх, а ўнутры механічнага цэха рух астатніх дэталей ад аперацыі да аперацыі ідзе самацёкам, па-за графікам і без адпаведнага ўліку.

Пры лічы зменных заданняў рабочым не ўлічваюцца элементарныя патрабаванні правільнай нагрузкі іх з пункту гледжання канкрэтнай камплектнасці. Рабочым даюцца заданні — апрацаваць на працягу 480 мінут неканкрэтныя дэталі, прычым некаторыя з іх не патрэбны сёння, заўтра і нават паслязаўтра.

Такім чынам, рабочы мае магчымасць апрацоўваць аблюбаваныя ім дэталі, а не тыя, якія патрэбны канкрэтна сёння з пункту гледжання роўнамернага, рытмічнага выпуску прадукцыі, не гаворачы ўжо аб тым, што культура вытворчасці патрабуе, каб да рабочага месца падавалася толькі столькі дэталей, колькі неабходна для апрацоўкі на працягу змены. Адсутнасць уліку руху дэталей прыводзіць да павелічэння скрытага браку і прапажы дэталей.

На заводзе імені Варашылава назіраецца меншая няроўнамернасць выпуску, асабліва ў лютым месяцы. Заводам праўлены першыя крокі ў галіне стварэння графіка роўнамернага выпуску, склазен вытворчы цыкл зборкі, з якога відаць, калі якія дэталі па тэрмінах патрэбны для зборачнага цэха. Другому механічнаму цэху спушчаны таблічы з указаннем тэрмінаў здачы асобных дэталей радыяльна-свярлільнага станка. Аднак роўнамернае, рытмічнае выкананне плана ўпіраецца ў адсутнасць графіка зладжанай работы ўсіх цэхаў, графіка запуску дэталей з загатоўчага цэха ў механічны. Адсутнасць яго не дае магчымасці механічнаму цэху своечасова забяспечыць тэрміны здачы на склад неабходных дэталей у адпаведнасці з патрабаваннямі зборачнага цэха, бо цэху невядомы час пачатку апрацоўкі дэталей. У другім механічным цэху няма графіка руху дэталей ад станка да станка.

З-за адсутнасці чоткага арганізацыйнага плана (заводскага дыспетчарскага раскладу) дыспетчары заводаў часта ператвараюцца ў простых звязістаў, у штурхачоў, адшукваючых недастачныя дэталі па падставе заявак зборачнага цэха.

Дыспетчарскія аддзелы заводаў павінны быць неадкладна рэарганізаваны. У аснове работы дыспетчара павінен ляжаць планграфік (арганізацыйны план) зладжанай работы ўсіх цэхаў; усе дзеянні дыспетчара павінны быць накіраваны к таму, каб не дапусціць адхіленняў ад устаноўленага рэжыма работы, ізложанага ў графіку.

Аператыўнае ўдзеянне на рух прадукцыі, аснованае на арганізацыйным плане, —вось у чым сутнасць дыспетчарскай службы. Яно забяспечыць заводам рытмічнасць у рабоце, штосутачнае выкананне плана.

На многіх прадпрыемствах лёгкай прамысловасці выпуск гатовай прадукцыі таксама адбываецца няроўнамерна, рыўкамі і вельмі часта скампэнтроўваецца к канцу месяца. На некаторых прадпрыемствах назіраецца няправільнае разуменне сутнасці сутачнага графіка. Так, напрыклад, на мінскай швейнай фабрыцы «8-е сакавіка» пад сутачным графікам разумеюць не сістэму арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па забеспячэнню выканання сутачнага задання, а давядзенне яго ў зменным і гадзінным разрэзе да асобных лент і рабочых. У рэзультаце крывая выпуску прадукцыі за студзень і люты месяцы наглядна аллюстроўвае ўкараніўшуюся на фабрыцы штурмаўшчыну, скачкападобную работу. Па фабрыцы ёсць усе ўмовы для роўнамернага выканання плана. Ёсць сыравіна, энергія, але няма адпаведнай арганізацыі, адпаведнага кіраўніцтва гэтай справай. Роўнамернаму, рытмічнаму выкананню плана перашкаджае адсутнасць рэальнага графіка рамонту, дрэнная абслугоўванне машын, адсутнасць адной-двух рэзервных пецельных машын, няспраўнасць трансмісіі, дрэнная арганізацыя падрыхтоўкі новых работніц і т. д.

Сутачны графік ставіць па-новаму ўсе карэнныя пытанні вытворчасці, ён патрабуе ўзаемадзеяння паміж усімі звеннямі прадпрыемства, чоткага аператыўнага кіраўніцтва і штодзённага кантролю за вытворчасцю.

Сутачны графік патрабуе ад кіраўнікоў умення глядзець уперад, загаляд прадугледзець ход вытворчасці і належным чынам накіроўваць яго. Пераход да работы па цвёрдаму графіку — асноўная задача гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічнага персанала прадпрыемстваў.

Сутачны графік — гэта аснова зладжанай работы цэхаў, важнейшы элемент культурнай арганізацыі вытворчасці, гэта шлях да перавыканання плана 1941 года.

**Е. С. АКСЕЛЬРОД,**
**дацэнт Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імені В. В. Куйбышэва.**

# Магутны рычаг далейшага ўздыму соцыялістычнага земляробства

Калгаснае сялянства Палескай вобласці, як і ўвесь беларускі народ, з вялікім натхненнем сустрэла пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей».

У гэтай гістарычнай пастанове партыя і ўрад намецілі праграму далейшага ўздыму соцыялістычнага земляробства. Перад калгасамі, соўгасамі і МТС адкрыты велічныя перспектывы гаспадарчага развіцця.

Тры чвэрці ўсёй плошчы дарэволюцыйнага Палесся займалі непраходныя балоты і лясы. Балоты з'яўляліся крыніцай бездарожжа, жабрацтва, хваробы; маларыя, каўтун былі бічом палескага селяніна.

Мары палескага селяніна аб меліярацыі балот у годы царызма былі бясплодны. Царскі ўрад аставаўся глухім да пяжкіх пакут народа. Экспедыцыя Жылінскага рабіла пясмелыя спробы па асушэнню балот, але яны датычылі толькі памешчыцкіх зямель. А доля палескага селяніна так і аставалася, што горкі палын.

Толькі пры совецкай уладзе на Палессі шырока разгарнуліся меліяратыўныя работы. Пры дапамозе тэхнікі, якою ўзброілі партыя і ўрад калгасы і соўгасы, пачалося наступленне на балоты.

З года ў год адваёўвалася ў балот новыя землі. «Дзікія», «доўгія», «пагібельныя» — так называліся раней у Палессі балоты. Цяпер яны пад папорам працоўнага энтузіязма калгаснікаў ператвараюцца ў высокаўраджайныя палі. Канулі ў нябыт хваробы каўтун і маларыя.

За апошнія годы ў калгасах нашай вобласці асушана звыш 32 тыс. гектараў балота. Асабліва значныя поспехі ў асушэнні і асваенні балот былі ў мінулым годзе. Зварот калгаснікаў Любаньскага раёна знайшоў жывы водгук ва ўсіх калгасах Палескай вобласці. Па скапчэнні веснавых палявых работ дзесяткі тысяч калгаснікаў і калгасніц выйшлі на асушку векавых балот, адваёўваць новыя тысячы гектараў зямлі. Штодзённа на меліяратыўным будаўніцтве працавала звыш 12 тысяч чалавек. Тысячы людзей свае здзённыя нормы перавыконвалі ў 2—3 і больш разоў.

У рэзультаце народнай ініцыятывы на працягу самага кароткага часу сіламі калгаснікаў у мінулым годзе было асушана 18 тысяч гектараў балот і забалочаных зямель пры плане ў 10 тыс. гектараў.

Калгасы Васілевіцкага раёна за 20 календарных дзён асушылі 3.050 гектараў замест плана ў 900 гектараў раскарчавалі кустоў 1.110 гектараў пры плане ў 400 гектараў і асвоілі 2.112 гектараў асушаных балот.

У Акцябрскім раёне асушана 2.294 гектары балот, што складае 382 процанты плана, паднята паліны 1.266 гектараў (316 процантаў плана); у Глускім раёне асушана 1.206 гектараў балот — 172,3 процанта плана.

Калгаснікі на практыцы пераканаліся, што затрачаная праца не прапала даремна. На асушаных балотах сабран ураджай у некалькі разоў вышэйшы, чым на мінеральных глебах.

З засеяных у мінулым годзе 5.053 гектараў асушанай плошчы атрыман сярэдні ўраджай зернавых культур па 15,15 цэнтнера з гектара, сена сеяных траў з плошчы ў 1.410 гектараў — па 44,2 цэнтнера, гародніны па 317 цэнтнераў з гектара, бульбы на 187 цэнтнераў. А ў асобных калгасах з асушаных балот сабран яшчэ вышэйшы ўраджай. Напрыклад, калгас «Парыжская комуна» (Васілевіцкі раён) атрымаў ураджай азімага жыта з плошчы ў 40 гектараў па 23 цэнтнеры з кожнага гектара, аўса з плошчы ў 23 гектары — па 26,8 цэнтнера, ячменю з плошчы ў 18 гектараў — па 22,5 цэнтнера.

Калгас «Новы Многаверш», гэтага-ж раёна, з 10 гектараў зняў па 205 пудоў проса з кожнага. Калгас «XII Кастрычнік» сабраў ураджай аўса па 24 цэнтнеры з кожнага гектара, ячменю — па 27 цэнтнераў, сена сеяных траў — па 60 цэнтнераў. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

За высокую ўраджайнасць на асушаных балотах 20 калгасаў вобласці ў мінулым годзе былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. За паспяховае выкананне меліяратыўных работ і высокую прадукцыйнасць працы Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР 17 чалавек узнагароджаны граматамі і пачотнымі граматамі, 103 калгаснікі, трактарысты і спецыялісты па меліярацыі прэміраваны Наркамземам БССР. Апрача гэтага звыш 100 чалавек былі прэміраваны раённымі арганізацыямі.

Імёны лепшых стаханаўпаў-калгаснікаў Нікалая Андрэевіча Смаглюк з Акцябрскага раёна (выконваўшага норму выпрацоўкі на земляных работах больш чым на 1000 процантаў). Нікіфара Захаранка, Івана Алісейка, Міны Белага — з Васілевіцкага раёна і многіх іншых вядомы далёка за межамі Палескай вобласці.

Калгасы вобласці перажываюць зараз дні вялікага вытворчага ўздыму. У кожным калгасе горача абмяркоўваецца пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушэнні балот і скарыстанні асушаных зямель.

У сваіх выступленнях усе калгаснікі і калгасніцы дзякуюць партыі, ураду і роднаму Сталіну за новую вялікую дапамогу беларускаму народу. З яшчэ большай энергіяй разгарнулася ў калгасах падрыхтоўка да меліяратыўных работ. Калгасы і калгаснікі бяруць на сябе абавязацельствы па ажыццяўленню сталінскай праграмы асушкі балот.

У калгасах распрацоўваюцца вытворчыя планы і графікі меліяратыўных работ. У Даманавіцкім раёне падрыхтавана больш 1.000 драўляных лапат, расчышчана 700 гектараў балот ад кустоў. У Парыцкім раёне падрыхтавана звыш 2.000 драўляных лапат. Узмоцнена ідзе расчыстка балот ад мелкалесся. У Акцябрскім раёне поўнасцю адрамантаваны ўсе балотныя плугі, дыскавыя бароны, балотныя каткі.

Ва ўсіх раёнах вобласці зараз працуюць курсы па падрыхтоўцы меліяратараў. Усяго на курсах да пачатку работ будзе падрыхтавана 500 чалавек.

У сельгасарцелі «Чырвоныя Лукі», Васілевіцкага раёна, пры абмеркаванні пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) калгаснікі ўзялі абавязацельства асушыць у гэтым годзе 150 гектараў балот супроць раней узятага абавязацельства 50 гектараў. Стаханавец-калгаснік гэтай арцелі тав. Заяц абавязаўся асабіста асушыць 20 гектараў балота.

Калгаснікі сельгасарцелі «Ударнік 2-й большэвіцкай вясны» (Лельчыцкі раён) у мінулым годзе раскарчавалі і асушылі 200 гектараў балота. Зараз, пасля абмеркавання гістарычнай пастановы, калгаснікі рашылі асушыць 400 гектараў балот і забалочаных зямель, зрабіць палепшанне сенажацей на плошчы ў 200 гектараў.

Калгаснікі сельгасарцелі «Ударнік» (таго-ж раёна) пасля абмеркавання рашэння СНК СССР і ЦК ВКП(б) рашылі пракласці 6-кілометравы магістральны канал. Для гэтай работы падрыхтаваны ўжо лапаты, шуфлі, шнуры і т. д. Брыгада Платона Філіпаўца з калгаса «Пабеда» ў адказ на пастанову партыі і ўрада абавязалася асушыць 75 гектараў балот замест плана ў 25 гектараў.

Калгаснікі сельгасарцелі «Комунар» (Нараўлянскі раён) абавязаліся асушыць у гэтым годзе 500 гектараў балот, пракапаць 3,6 кілометра магістральнага канала, 5,5 кілометра калектараў і 13,5 кілометра мелкай асушальнай сеткі.

Па ініцыятыве пярвічнай комсамольскай арганізацыі гэтага калгаса падрыхтавана ўжо 100 грабарскіх лапат.

МТС вобласці таксама актыўна ўключыліся ў падрыхтоўчыя работы. Юлчанская МТС Камарынскага раёна вывела на балота кустарэз, які расчышчае балота ад кустоў. Пачалі працаваць кустарэзы Ельскай, Васілевіцкай, Даманавіцкай і іншых машынатрактарных станцый.

У раёнах ідзе вялікая работа па складанню аператыўных планаў. Аператыўны план па кожнаму калгасу складаецца з удзелам саміх калгаснікаў. Планам прадугледжваецца ўвесь аб'ём работ па кожнаму аб'екту, улічваюцца мерапрыемствы, забяспечваючыя выкананне меліяратыўных работ—разбіўка ўчасткаў за брыгадамі і звеннямі, тэрміны загатоўкі лапат, напільнікаў, рашпіляў, тачыл, шнуроў і іншага неабходнага матэрыяла, а таксама размеркаванне яго па брыгадах і дастаўка на месца работ.

Планам устанаўліваюцца дыферэнцыраваныя нормы выпрацоўкі ў адзін чалавека-дзень асобна па магістральных каналах, калектарах і асушальніках. Распрацоўваюцца мерапрыемствы па культурнаму абслугоўванню калгаснікаў. На кожны аб'ект будуць дастаўляцца газеты, журналы, усюды будуць выпускацца насценныя газеты, а таксама штодзённыя бюлетэні, якія адлюстроўваюць выкананне ўстаноўленага графіка кожнай брыгадай.

На больш буйныя аб'екты райкомы партыі вылучаюць вопытных таварышоў начальнікамі ўчасткаў і парторгамі будоўляў. Васілевіцкі, Даманавіцкі і Нараўлянскі райкомы ўжо закончылі адбор начальнікаў участкаў і парторгаў. Апрача гэтага сотні комуністаў будуць працаваць непасрэдна на вытворчасці.

Вялікую работу па падрыхтоўцы да меліяратыўных работ разгарнулі абласныя арганізацыі. Облгандальаддзел прыступіў да арганізацыі перасоўных ларкоў, палаток, латкоў. Гандлюючыя арганізацыі вызначаюць гандлёвыя точкі на аб'ектах меліяратыўных работ. У раёны завозяцца кіпяпільнікі, вёдры, гаспадарчая пасуда. Абласны аддзел аховы здароўя арганізуе яслі, пункты медыцынскай дапамогі; на месцы правядзення работ выедуць медыцынскія работнікі, якія будуць абслугоўваць калгаснікаў аж да скапчэння работ. Многапромсаюз вырабляе тапары, лапаты, вёдры. Першая партыя гэтых прадметаў ужо накіравана ў калгасы.

Тысячы агітатараў—партыйных і непартыйных большэвікоў — праводзяць работу па растлумачэнню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) калгаснікам і калгаснікам.

Планам работ на 1941 год на нашай вобласці было намечана асушыць 20 тысяч гектараў балот і асвоіць столькі-ж. Але пры абмеркаванні гэтага плана калгасы абавязаліся асушыць 30 тысяч гектараў балот і асвоіць 25 тысяч гектараў.

Няма сумнення, што зараз, пасля гістарычнага рашэння партыі і ўрада і той вялікай дапамогі, якая аказваецца Беларускай рэспубліцы, — гэта абавязацельства не толькі будзе выканана, але і перавыкана. Аб гэтым гаворыць тое здпадушнае адабрэнне, з якім было сустрэта рашэнне партыі і ўрада. Аб гэтым гаворыць новыя абавязацельствы, якія бяруць на сябе калгасы і калгаснікі. Аб гэтым гаворыць разгарнуўшаяся вялікая падрыхтоўчая работа да прадстаячай асушкі балот.

Для кожнага комуніста і комсамольца, працуючага ў сельскай гаспадарцы, няма зараз больш важнай задачы, чым выкананне рашэнняў партыі і ўрада па меліяратыўнаму будаўніцтву. Партыйныя арганізацыі вобласці павінны ўзяць у свае рукі кіраўніцтва асушкай і асваеннем забалочаных зямель і з часцю выканаць ускладзеныя на іх партыяй і ўрадам задачы.

**П. А. ЛЯ[illegible]ЦКІ,**
**сакратар Палескага абкома КП(б)Б.**

Сталінскія лаўрэаты

# ЛЕПШЫ КАМПАЗІТАР

З пачуццём найвялікшай гордасці адзначаюць прапоўныя ордэнаноснай рэспублікі ўзнагароджанне Сталінскімі прэміямі выдатных прадстаўнікоў беларускай совецкай культуры.

Сярод сталінскіх лаўрэатаў усенароднае прызнанне атрымаў і таленавіты кампазітар Анатолій Васільевіч Багатыроў, узнагароджаны за оперу «У пушчах Палесся».

Лаўрэат Сталінскай прэміі Багатыроў— адзін з найбольш яркіх і адароных прадстаўнікоў маладога пакалення беларускіх кампазітараў. Ён многа папрацаваў для росквіту беларускага музыкальнага мастацтва, нацыянальнай беларускай оперы.

Уся музыка Багатырова прасякнута глыбокім адчуваннем паэзіі беларускай прыроды, прасторамі яе лясоў і палёў. У ёй жыве выключная юнацкая свежасць, аптымізм, радасная пранікнёная лірыка.

Адзін з самых маладых сталінскіх лаўрэатаў, Багатыроў, з'яўляецца адным з тых совецкіх кампазітараў, якія ствараюць яркія нацыянальныя творы, прасякнутыя глыбокім ідэйным зместам. Творчасць Багатырова — дзецішча велічнай эпохі соцыялізма, якая выпеставала дараванне совецкага кампазітара і ўвасобіла ў яго музыцы лепшыя рысы беларускага народнага мастацтва.

Багатыроў здолеў стварыць у сваёй оперы «У пушчах Палесся» хвалюючую карціну барацьбы беларускага народа з белапалякамі ў 1920 годзе.

Высокая ідэйнасць оперы, гераічны пафас, глыбокая лірыка і вобразная музыкальная мова, блізкая народнай песні, робяць яе гераічнай музыкальнай эпапеяй. Багатыроў сваім творам назаўсёды звязаў сябе з гісторыяй сваёй радзімы.

Анатолій Васільевіч атрымаў у спадчыну выдатную якасць вялікіх мастакоў мінулага. Ён ніколі не чакае, пакуль натхненне з'явіцца да яго, наадварот — ён сам ідзе яму насустрач, ён нястомна працуе, з дня ў дзень павышае сваю культуру, удасканальвае сваю тэхніку, майстэрства, засвайвае спадчыну рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў. Яшчэ ў час вучобы ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па класу кампазіцыі, у Нікалая Ільіча Алаева, а потым у прафесара Васілія Андрэевіча Залатарова, Анатолій Багатыроў па пэлых гадзінах праседжваў за партытурамі, упітваючы і творча засвайваючы музыкальную культуру вялікіх мастакоў мінулага.

Па складу сваёй даравітасці Багатыроў — выдатны лірык-меладыст і тонкі псіхолаг. Гэтыя рысы, неабходныя для аўтара музыкальна-драматычных твораў, глыбока і ярка праявіліся ў яго оперы «У пушчах Палесся». У асобных выпадках Багатыроў дасягае выключна глыбокага пранікнення ў псіхалогію сваіх герояў. Тут перш за ўсё трэба ўказаць на вобраз Саўкі. Саўка — асоба трагічная ў поўным сэнсе гэтага слова, і кампазітару ўдалася нарысаваць яркія, хвалюючыя карціны перажыванняў няшчаснага чалавека.

Творчасць Багатырова карэннямі ідзе ў пласты народнага беларускага мастацтва, жыве і жывіцца яго сокамі. Таму пры ўсім багацці гармоніі, шчодрай і каларытнай інструментоўцы, складанасці тэматычнага развіцця — яго музыка астаецца простай і яснай, зразумелай і даступнай. У ёй малады 28-гадовы кампазітар апявае прыгожасць і радасць жыцця, уцвярджаючы ў музыцы нашу тэматыку, нашу цудоўную рэчаіснасць.

Пята да музыкі, жаданне вучыцца, і ў асаблівасці пісаць, тварыць музыку, заваёўваюцца ў Багатырова ў маленстве. У 13-гадовым узросце будучы майстар народнай музыкальнай драмы робіць спробу напісаць на тэкст Байрана дзіцячую оперу ў 4-х дзеях «Двое Фаскары». Гэта смелая дзіцячая задача аказалася вельмі знамянальнай: роўна праз дзесяць год кампазітар пачаў сваю работу над операй «У пушчах Палесся». Цяга да музыкі прывяла Багатырова ў Віцебскую музыкальную школу, а потым у Беларускае музыкальнае вучылішча і кансерваторыю. Заняткі па кампазіцыі прыводзяць да інтэнсіўнага развіцця таленту Багатырова. У 1937 годзе, ва ўзросце 24 год, ён вылатна заканчвае кампазітарскае аддзяленне Беларускай кансерваторыі.

Да год вучобы ў кансерваторыі адносяцца творы «Скерцо» для сімфанічнага аркестра, фартэпіяннае трыо, варыяцыі для фартэпіяна і рад дробных п'ес, песень і т. п. Экзаменацыйнай работай Анатолія Багатырова з'явілася цікавейшая паэма «Казка аб мядзведзісе», на тэкст Пушкіна, для хора з сімфанічным аркестрам. Ужо ў гэтым творы выявіліся тэндэнцыі да самастойнасці творчага метада кампазітара. Музыкальная мова «Казкі» вызначаецца сваёй выразнасцю і вельмі вернай перадачай інтанацыі і сюжэтнай ткані геніяльнага твора Пушкіна. К гэтаму часу адносіцца і першая сімфонія, у якой, побач з прыкметнымі слядамі ўплыву лірыкі Чайкоўскага, выяўляецца рад цікавых якасцей, якія дазваляюць чакаць ад кампазітара каштоўных укладаў у беларускую сімфанічную музыку. Гэтыя якасці ярка праявіліся ў першай частцы, якая вызначаецца сваім парывістым, валявым характарам і, у асаблівасці, у юнацка-задорным фінале, поўным непасрэднасці і шчырасці.

У шматлікіх апрацоўках беларускіх песень кампазітар праявіў вялікую любоў да народнай творчасці, народнай паэзіі, якая аплаквала ранейшую долю беларускага народа і выражала яго пакуты і радасць, пратэст і нянавісць да прыгнятальнікаў. Вось тут, у народнай творчасці, у паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа, і трэба шукаць крыніцу творчага натхнення кампазітара.

Але не толькі ў народнай творчасці і паэзіі беларускіх пісьменнікаў шукае Багатыроў яркія мастацкія вобразы. Сур'ёзнае вывучэнне класічнай рускай і украінскай паэзіі прыводзіць яго да напісання раду рамансаў і хораў на словы Пушкіна, Лермантава, Шэўчэнкі і іншых. У апошні час, у сувязі з набліжаючымся 100-годзіем з дня пагібелі Лермантава, Багатыровым напісана 6 рамансаў і музыка да паэмы «Мцыры».

Вілае месца ў творчасці Багатырова займае абаронная тэматыка: нядаўна напісаная ім масавая баявая песня «Сотай дывізіі» несумненна ўвойдзе ў рэпертуар чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці і харавых гурткоў.

Багатыроў належыць да той плеяды маладых совецкіх кампазітараў, якія, побач з творчай дзейнасцю, вядуць вялікую грамадскую, дзяржаўную работу. Яна не толькі не перашкаджае, але, наадварот — дапамагае і ўзбагачае творчыя стымулы кампазітара. У напружаныя дні работы над операй «У пушчах Палесся» ў 1938 годзе Багатыроў, у ліку лепшых прадстаўнікоў совецкай інтэлігенцыі, быў выбран дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Працоўныя ордэнаноснай рэспублікі высока ацанілі яго творчасць і вялікую работу на пасту старшыні Саюза совецкіх кампазітараў Беларусі.

У дні падрыхтоўкі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве Багатыроў вельмі актыўна дапамагаў Тэатру оперы і балета хутчэй справіцца з пачотнай задачай пастаноўкі першых беларускіх нацыянальных опер, ведучы адначасова вялікую і адказную работу, як дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

У такой яркай, кіпучай грамадскай і дзяржаўнай рабоце, у глыбокім пранікненні ў гераічныя будні нашай краіны ствараўся выдатны твор беларускага музыкальна-драматычнага мастацтва — опера «У пушчах Палесся».

Гэта опера сведчыць аб яркім таленце кампазітара, аб росквіце беларускай культуры.

**Б. СМОЛЬСКІ.**

Прэм'ера оперы «Травіята» ў пастаноўцы Дзяржаўнага ордэна Леніна Вялікага тэатра оперы і балета БССР. Опера ў 4-х дзеях. Музыка Вердзі.

На здымку: сцэна з другой дзеі. У ролі Віалеты Валеры — заслужаная артыстка БССР Л. Ф. Аляксеева. Ролю Жоржа Жермона выконвае заслужаны артыст БССР ордэнаносец М. І. Дзянісаў. Фото С. Вальфсона. (БЕЛТА).

# Рэпертуар БДДТ-1 у новым сезоне

Рэпертуар — аснова дзейнасці тэатра, ён вызначае яго палітычны і мастацкі твар.

Рэпертуар Першага Беларускага Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра на 1941 год складаецца з 7 новых п'ес. Асноўнае месца ў ім займаюць п'есы совецкіх аўтараў, напісаныя на сучасныя тэмы.

Сярод іх — новая арыгінальная п'еса вядомага беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага — «Ірынка», паказваючая адзін з выдатнейшых момантаў у жыцці беларускага народа — з'яднанне заходніх абласцей з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай. Кузьме Чорнаму ўдалося стварыць рад цікавых і глыбокіх вобразаў.

Ставіць «Ірынку» рэжысёр заслужаны артыст БССР М. Зораў. Мастак—І. Ушакоў.

Над новай п'есай з сучаснага жыцця працуе для нашага тэатра драматург-ордэнаносец Кандрат Крапіва.

Апрача арыгінальных беларускіх п'ес, мы ў 1941 годзе пачалі работу над лепшымі творамі пісьменнікаў брацкіх совецкіх рэспублік. Рыхтуецца п'еса рускага драматурга А. Афінагенава — «Машанька». У п'есе вельмі цікава распрацавана праблема выхавання нашай моладзі. Сямідзесяцігадовы старык і пятнаццацігадовая дзяўчынка — вось два полюсы ўзросту. Здавалася-б, паміж імі не можа быць нічога агульнага. Аднак жыццё зближае Машаньку з дзедам. І сапраўды, юная, імклівая Маша ўносіць у замкнуты кабінет вучонага веснавое святло, і паміж дзедам і ўнучкай нараджаецца вялікая любоў і дружба.

Ставіць «Машаньку» рэжысёр К. Сапнікаў. Мастак — С. Дабжынскі.

Паралельна ідзе работа над камедыяй вядомага украінскага драматурга А. Карнейчука «У стэпах Украіны». Гэта, бясспрэчна, твор вялікага палітычнага значэння, бо ў ім праўдзіва паказана сучасная калгасная вёска і яе людзі. Аўтару ўдалося ўлавіць і мастацка перадаць тое новае, што ёсць у псіхалогіі і свядомасці нашых калгаснікаў, насычыць гэты паказ сакавітым народным юмарам.

Ставіць п'есу «У стэпах Украіны» заслужаны артыст БССР Л. Рахленка. Мастак — Д. Власюк.

Прэм'еры гэтых спектаклей павінны адбыцца на працягу красавіка—мая месяцаў.

У першых чыслах чэрвеня тэатр едзе на гастролі ў г. Одэсу.

У час летніх гастролей будзе працягвацца работа над пастаноўкай бессмертнай трагедыі Шэкспіра «Рамео і Джульета», якую ставіць рэжысёр заслужаны артыст БССР В. Галаўчынер. Мастак — В. Дзмітрыеў.

Уся папярэдняя работа над п'есай закончана. Калектыў праслухаў некалькі лекцый аб Шэкспіру і яго эпосе, прачытаных спецыяльна запрошаным з Масквы прафесарам Марозавым. Індывідуальная праца з акторамі, выканаўцамі галоўных ролей, пачнецца ў бліжэйшыя дні.

Сярод асноўных выканаўцаў — народная артыстка БССР І. Ждановіч (Джульета), заслужаны артыст БССР Б. Платонаў (Рамео), народны артыст БССР В. Владамірскі (Капулеці), заслужаная артыстка БССР Л. Ржэпкая (кармініна).

За лета павінна быць таксама падрыхтавана і закончана работа над пастаноўкай адной з п'ес М. Горкага.

Да ліку лепшых спектакляў рэпертуара гэтага года трэба аднесці пастаўленую не так даўно п'есу вядомага французскага драматурга Віктар'ена Сарду «Фландрыя», напісаную ім у 1869 годзе.

Гэта, бясспрэчна, адна з лепшых п'ес Сарду. Асновай для яе сюжэта паслужылі рэальныя гістарычныя падзеі эпохі завяавання Нідэрландаў іспанскім каралём Філіпам II. У ёй ярка паказана расправа крывавага герцага Альба над свабодалюбнымі фламандцамі ў XVI стагоддзі.

Мы не памыліліся, калі лічылі п'есу «Фландрыя» актуальнай. Сапраўды, тэмы бязмежнай любві да радзімы, гераізма народа ў барацьбе з інтэрвентамі, якія распрацаваны ў творы, глыбока хвалююць і сучаснага гледача.

Апрача таго, элементы рамантычнай прыўзнятасці і яркіх страсцей, якія знойдзены ў спектаклі «Фландрыя», дапамогуць у працы над спектаклем «Рамео і Джульета», які павінен з'явіцца далейшым, больш высокім этапам пошукаў тэатра ў гэтым напрамку.

Адною з пастановак гэтага года павінна з'явіцца п'еса, прысвечаная паказу гераічных старонак ваеннага мінулага нашага народа. На шырокім сцэнічным палатне тэатр хоча паказаць аднаго з слаўных рускіх палкаводцаў эпохі народнай вайны з Напалеонам Банапартам у 1812 годзе. Гэтай задачы адпавядае п'еса В. Салаўёва «Фельдмаршал Кутузаў».

Вялікай задачай тэатра ў далейшай рабоце над рэпертуарам з'яўляецца стварэнне спектакля, прысвечанага набліжаючайся дваццаць пятай гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. У гэтым напрамку тэатр праводзіць рад мерапрыемстваў.

**Е. РАМАНОВІЧ.**

# БОЛЬШ УВАГІ ВЫКЛАДАННЮ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ

СНК СССР і ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове ад 16 мая 1934 года «Аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах СССР» паставілі перад совецкім настаўніцтвам задачу па-новаму арганізаваць выкладанне гісторыі і дабіцца таго, каб вучні асвоілі асновы навуковай гісторыі, каб яны ўзбагаціліся ведамі важных гістарычных з'яў і фактаў у іх храналагічнай паслядоўнасці, а таксама ведамі аб гістарычных дзеячах.

Выкладанне гісторыі павінна быць наглядным і канкрэтным, даступным для разумення вучняў.

Сектарам культасветработы аддзела прапаганды і агітацыі Брэсцкага абкома партыі праведзена праверка выкладання гісторыі ў школах абласці. Многія школы і настаўнікі дабіліся значных поспехаў у гэтай справе. Выкладчык сярэдняй школы № 15 гор. Брэста тав. Шабека правёў у восьмым класе паўтарэнне тэмы «Рэволюцыя 1789 года». З 9 апрошаных вучняў усе адказалі на выдатна і добра. Вучаніца Далінская падрабязна ізлажыла ідэалогію буржуазіі, ахарактарызавала палітычныя погляды і тэорыі Вальтэра, Мантэск'е, Русо. Вучань Каплан свой расказ аб скліканні генеральных штатаў у Францыі пачаў з ленінскага вызначэння рэволюцыйнай сітуацыі і ўказаў на паяўнасць яе ў канцы XVIII стагоддзя ў Францыі, пацвярджаючы гэта канкрэтным матэрыялам. Вучань Купрыевіч змястоўна і падрабязна ахарактарызаваў якабінскую дыктатуру, назваў усе важнейшыя даты, імёны віднейшых дзеячоў. Вучаніца Барысава ўмела ізлажыла асноўныя прынцыпы Канстытуцыі і дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна.

Выкладчык тав. Шабека сур'ёзна працуе над сабой, у сваёй рабоце скарыстоўвае дадатковую мастацкую літаратуру, творы класікаў марксізма-ленінізма. Урокі т. Шабекі змястоўныя, праходзяць на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

У сувязі з заканчэннем у VI класе Сямяніцкай няпоўнай сярэдняй школы тэмы «Рым» выкладчык т. Мартынаў паставіў вучням рад пытанняў па пройдзенаму матэрыялу. Вучань Дзермалюк падрабязна абрысаваў становішча рабоў у Рыме, расказаў пра Спартака як арганізатара паўстання рабоў, пра яго паходы, а таксама ахарактарызаваў прычыны паражэння паўстанцаў.

Каштоўным з'яўляецца і тое, што вучні запомнілі выказванні класікаў марксізма-ленінізма аб гістарычных дзеячах. Вучаніца Жук расказала, як высока ацэніў Ленін Спартака. Вучань Вакулік правільна вылічыў час, які прайшоў ад паўстання Спартака да сучаснага моманту. Вучаніца Камінская падрабязна расказала пра другую пунічаскую вайну, аб бітвах пры Транзіменскім возеры, Каннах і Заме з паказам гэтых месц на карце, пра Ганібала.

Урок паказаў, што т. Мартынаў дабіўся моцнага ўсваення вучнямі праграмнага матэрыялу па гісторыі. Тав. Мартынаў добрасумленна адносіцца да выкладання свайго прадмета. У працэсе вывучэння праграмнага матэрыялу ён складае з вучнямі храналагічныя таблицы, часта паўтарае храналагічныя даты і факты з мінулага па пройдзенаму курсу. Паўтараючы вучэбны матэрыял, настаўнік патрабуе ад вучняў ведання карты.

Узоры работы паказваюць выкладчыкі гісторыі Гайнаўскай сярэдняй школы т. Шахава, Пружанскай сярэдняй школы т. Мадорскі, настаўніца IV класа 5-й школы гор. Брэста т. Праневіч і іншыя.

Аднак пры праверцы ўскрыт рад сур'ёзных недахопаў у выкладанні гісторыі. Многія выкладчыкі суха, схематычна, без усякай сувязі падаюць гістарычныя падзеі, а часта зводзяць урок да чытання і пераказаў падручніка, дапускаюць недакладнасці, блытаніну і нават грубыя памылкі. Асабліва дрэнна абстаіць справа з выкладаннем гісторыі СССР у III—IV класах.

Настаўніца Кобрынскай пачатковай школы т. Г., напрыклад, так тлумачыла тэму «Князь Святаслаў»: «Раней людзі жылі як папала, таму Святаслаў і еў сырое мяса і спаў, падкладваючы пад галаву сядло». Яе ўрокі не выхоўваюць у вучняў марксісцка-ленінскага светапогляду.

Настаўніца IV класа Сямяніцкай школы т. П., паўтараючы з вучнямі тэму «Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя», прышла да вываду, што ў 1917 годзе адбыўся... чацвёрты з'езд партыі, што на гэтым з'ездзе абмяркоўвалася пытанне аб тым, хто можа быць членам партыі і т. д.

Такая блытаніна — вынік таго, што настаўніца не рыхтуецца да ўрокаў і наогул не працуе над павышэннем сваёй палітычнай пісьменнасці, не вывучае гісторыю ВКП(б). Дырэктар школы (дарэчы, ён-жа і выкладчык гісторыі) не быў ні разу на ўроку ў т. П. і не аказвае ёй патрэбнай дапамогі.

Абсалютнае няведанне свайго прадмета паказаў выкладчык гісторыі Высокаўскай няпоўнай сярэдняй школы т. Г. Ён прыходзіць на ўрокі без усякай падрыхтоўкі, без планаў і канспектаў. За 45 мінут ён умудрыўся «растлумачыць» вучням V класа матэрыял, разлічаны на 10 урокаў.

Фармальна адносяцца некаторыя настаўнікі да складання планаў урокаў. Так, напрыклад, планы ўрока гісторыі настаўніка Толвінскай няпоўнай сярэдняй школы т. Варывончыка заключаюць у сабе жакалькі слоў: «Апытанне вучняў, тлумачэнне новага і заданне на дом». Урок на тэму «Паход Ксеркса» настаўнік пачаў тлумачыць за 15 мінут да званка, прычым «улажыўся» ў 10 мінут.

Многія настаўнікі не растлумачваюць складаныя гістарычныя паняцці, назвы, розныя тэрміны, у выніку чаго вучні іх завучваюць механічна. Напрыклад, вучні расказваюць змест рэформы Сервія Тулія, але-ж не могуць адказаць на пытанне: «Што дала рэформа маемасным класам і, з другога боку — рабам і пролетарыям».

Вялікая блытаніна атрымліваецца з канспектамі вучняў. Яны не прывучаюцца канспектыраваць, а імкнуцца запісваць усё, што гаворыць настаўнік. У выніку замест успрыняцця жывой гуткаркі настаўніка ўрок ператвараецца ў дыктоўку. У спытках вучняў атрымліваецца шмат памылак і скажэнняў. Так, напрыклад, вучаніца трэцяга класа Гайнаўскай школы Г. напісала: «Пасля Ігара стала правіць яго жонка Вольга 945—772 отхспила дрэвянным за мужа». У спытку вучаніцы VI класа Х. запісана замест слова «Вільгельм» — «Вергель» і т. д.

У рабоце настаўнікаў-гісторыкаў да гэтага часу ёсць многа няжасцей. Ахсутнічае дастатковая колькасць падручнікаў. Асобныя дырэктары і загадчыкі школ, аддзелы народнай асветы мала ўвагі ўдзяляюць выкладанню гісторыі. Гэта пытанне не абмяркоўваецца на педсоветах, метадычных аб'еднаннях, не практыкуюцца адкрытыя ўрокі.

Выпадкі праверкі абмяркоўваліся на бюро абкома КП(б)Б. Прынят рад практычных мерапрыемстваў для паляпшэння выкладання гісторыі ў школах.

Важнейшая задача кіраўнікоў школ, аддзелаў народнай асветы ўзняць якасць урокаў і забяспечыць выкладанне гісторыі на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

**Я. Н. МАРОЗАЎ,**
**загадчык сектара культасветработы аддзела прапаганды і агітацыі Брэсцкага абкома КП(б)Б.**

## 10 год раённай газеце „Ленінскія заветы"

16 сакавіка раённая газета — орган Тураўскага РК КП(б)Б і райсовета дэпутатаў працоўных — «Ленінскія заветы» адзначыла дзесяцігоддзе свайго існавання.

У юбілейным нумары другая старонка газеты прысвечана расказам аб вялікім росце калгаснай гаспадаркі раёна, аб культуры і грашовых прыбытках калгаснага сялянства раёна. Усё гэта падмацавана прыкладамі з калгасаў.

На трэцяй старонцы змешчаны выказванні чытачоў аб сваёй газеце.

# Ефрэйтар Круглоў

Да прызыва Віктар працаваў слесарам на хімічным заводзе ў родным падмаскоўным сяле. Добры стаханавец у цэху, ён і ў гадзіны адпачынку не мог сядзець склаўшы рукі. Ён—энергічны футбаліст, удзельнік спаборніцтваў па бегу, выдатны лыжнік і стралок.

На курсах пагранічнікаў Круглоў аўладаў спецыяльнасцю кулямётчыка. На заставе ён даведаўся, як многа дапамагае пагранічніку добра абучаны сабака. Гэта яго зацікавіла. Ён падружыў з важатым службовага сабакі тав. Грэцкім і ў вольны час з цікавасцю слухаў яго расказы аб прывычках і паводзінах жывёлы, аб метадах яе абучэння, аб прынятых камандах. Неўзабаве Круглоў стаў знатаком гэтай справы.

...Зімняя ноч у заснежаным лесе. Густая завіруха слепіць вочы. Дзікім звярам вые ў верхавінах вецер. Такое падвор'е часцей за ўсё выбіраюць нарушальнікі для сваіх злачынных мэт. Круглоў гэта вельмі добра ведае, і ён на варце. Яго чацвераногі друг, прысеўшы на край кажуха пагранічніка, памінутна паварачвае сваю разумную галаву ва ўсе бакі. Раптам сабака занепакоіўся: то загляне ў вочы гаспадара, то паглядзіць у бок граніцы. Ясна — тут нехта паявіўся. Аслабіўшы павадок, Круглоў аспярожна ідзе ўслед за сабакам. Аспярожнасць, аспярожнасць! Нельга сябе выявіць раней часу — такі непахісны закон воіна. Упередзе мільгануў сілуэт і прыліп да ствала дрэва, зноў мільгануў і прыхіліўся да другога дрэва. У адказ на нечаканы звонкі крык «стой!» нарушальнік на ўсе ногі кінуўся бегчы назад да граніцы. Але моцны штуршок у спіну валіць яго з ног. «Пірат» моцна трымае яго ў лапах і пры малейшым супраціўленні гатоў усадзіць вострыя клыкі ў горла непрошанага госця.

Колькі падобных эпізодаў было ў яго за два з лішнім годы службы, Круглоў не памятае — лік страціў. Але ў яго ёсць тры спісаныя сшыткі; у іх запісаны найбольш важныя падзеі з яго пагранічнай вахты. Праўда, там не расказваецца, як быстра аўтар запісаў бегае па слядах нарушальніка, колькі храбрасці, розуму, энергіі ён праяўляе пры ахове граніцы. Аб гэтым падрабязна расказваюць яго прыяцелі і начальнікі. Але і скупы сюжэт дзённіка гаворыць вельмі аб многім.

Аднойчы на заставе быў атрыман сігнал, што пры затрыманні групы нарушальнікаў некаторыя прарваліся ў глыб совецкай тэрыторыі. Не паспеўшы яшчэ ўздрымнуць пасля начнога дзяжурства, Круглоў быстра апрануўся, стаў на лыжы і разам з «Піратам» пакіраваўся на пошукі. Сабака неўзабаве ўзяў след і нацягнуў павадок. Услед за ім на лыжах паспяшаў важаты. Сляды былі страшна заблытаны—то яны разыходзіліся ў розныя бакі, то выходзілі на дарогу і зліваліся з сотнямі іншых слядоў. Звыш дзесяці кілометраў прабег Віктар без адпачынку. «Знайсці ворага, куды-б ён ні схаваўся, пра сячы яго злачынныя мэты»—гэтыя мысліі надавалі яму невычарпальныя сілы. У невялікім ляску сабака спыніўся і стаў паглядваць на гаспадара. Нарушальнікі былі дзесьці недалёка. Неўзабаве Круглоў убачыў групу людзей, прасоўваўшыхся лесам. Заўважыўшы пагранічніка, яны рассыпаліся па лесе і рыхтаваліся аказаць упорнае супраціўленне. У такой абстаноўцы затрымаць іх аднаму байцу пяжка. Але Круглоў быў не адзін, а з надзейным памочнікам. То адзін, то другі нарушальнік нечакана для сябе падвергся нападу ззаду. Калі падаспелі іншыя пагранічнікі, усе нарушальнікі былі ўжо абшуканы і звязаны. «Пірат» палабраў па кустах і паклаў ля ног важатага ўсе раскіданыя нарушальнікамі рэчы, у тым ліку і маленькі залаты гадзіннік.

Кожны дзень на граніцы настолькі насычан падзеямі, што годы службы на ахове рубяжоў совецкай радзімы на ўсё жыццё астануцца ў памяці Круглова.

Навечна астанецца ў памяці і люты 1941 года. У пачатку гэтага месяца Круглову за выдатную баявую і палітычную падрыхтоўку прысвоілі званне ефрэйтара. Да 20-годдзя пагранічных войск СССР Наркамат унутраных спраў узнагародзіў маладога ефрэйтара значкам «Выдатніку РСЧА». Праз пекалькі дзён Круглоў прачытаў сваё прозвішча ў газетах. Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР узнагародзіў яго медалём «За адвагу». Яго заслугі перад радзімай былі высока ацэнены. Гэта — сапраўднае шчасце.

Віктар Круглоў і тысячы яму падобных пагранічнікаў пільна ахоўваюць недатыкальнасць совецкіх рубяжоў.

**Е. ТАЙЧЫН.**

# Абарона насельніцтва ад паветраных бамбардыровак

*(Па вопыту вайны ў Еўропе)*

Сучасная вайна з яе шырокім прымяненнем авіяцыі дальняга дзеяння стварае рэальную пагрозу гарадам і населеным пунктам як паблізу фронта, так і ў глыбокім тылу ваюючых старон. Бамбардыроўка англійскіх гарадоў германскай авіяцыяй, налёты англійскіх бамбардыроўшчыкаў на Германію і нават на далёкія ад англійскіх баз італьянскія гарады паказалі, якой небяспецы падвяргаецца грамадзянскае насельніцтва ў тылу.

Абарона насельніцтва ад паветранага нападу—адна з сур'ёзнейшых праблем сучаснай вайны. Як вырашаецца гэта праблема ў англа-германскай паветранай вайне?

Абарона грамадзянскага насельніцтва ў Англіі і ў Германіі праводзіцца па трох асноўных напрамках: па-першае, ужываюцца рознага роду сховішчы для ўкрыцця насельніцтва ад паветраных бамбардыровак; па-другое, арганізуюцца самадзейныя каманды з грамадзянскага насельніцтва для прынятага мер бязпаснасці да налёту праціўніка і для барацьбы з вынікамі бамбардыровак; па-трэцяе, несамадзейнае насельніцтва (старыкі, жанчыны, дзеці) эвакуюцца ў менш пагражаемыя раёны.

Вопыт паказаў, што найбольш станоўчыя рэзультаты даюць укрыцці насельніцтва ў сховішчах і чотка працуючыя самадзейныя каманды з асяродзя насельніцтва. Эвакуацыя-ж жанчын і дзяцей з найбольш пагражаючых раёнаў у месцы, дзе небяспека падвергнуцца бамбардыроўцы з паветра менш магчыма, мэты ў асноўным не дасягнула, і большая частка эвакуіраванага насельніцтва вярнулася на свае месцы. Ва ўмовах сучаснай вайны, калі авіяцыйная тэхніка бесперапынна расце, калі скорасць і дальнасць самалётаў усё больш павялічваюцца, уся тэрыторыя ваюючых старон падвяргаецца вялікай паветранай небяспецы і абсалютна не пагражаючых па паветранай небяспецы раёнаў няма нават у глыбокім тылу. Гэта асабліва адносіцца да Брытанскіх астравоў.

У Англіі для захавання жыцця грамадзянскага насельніцтва прымяняюцца два асноўныя віды сховішчаў: 1) глыбокія сховішчы ў выглядзе танелей (тыпу метро), якія заспераг аюць ад дзеяння ўсіх відаў бомб, і 2) невялікія, разлічаныя на адну сям'ю, часовыя сховішчы Андэрсона, якія заспераг аюць толькі ад асколкаў і ўзрыўной хвалі авіябомбы. Побач з гэтымі сховішчамі ў Англіі рыюць траншэі ў выглядзе акопаў або траншэі, якія ўтвараюцца з складзеных радамі мяхоў з пяском, якія таксама прызначаюцца для заспарагання ад асколкаў і ўзрыўной хвалі авіябомбы.

Да першага віду сховішчаў адносяцца танелі метро і спецыяльна вырытыя пад зямлёй на глыбіні звыш 15 метраў танелі, а таксама падвалы буйных будынкаў, умацаваныя дадатковым перакрыццем.

Гэты від сховішчаў найбольш забяспечвае бязпаснасць насельніцтва, але іх мала, і ўкрыць у іх усё насельніцтва немагчыма. Міністр унутраных спраў Англіі Марысон заявіў па радыё, што забяспечыць глыбокімі сховішчамі ўсё або большую частку насельніцтва Англіі зараз немагчыма. Пры спрыяючых умовах глыбокія сховішчы будуць будавацца, сховішчы ў танелях метро будуць расшыраны, і там, дзе гэта дазваляе характар мясцовасці, будуць стварацца новыя танелі.

Больш за ўсё распаўсюджан у Англіі другі від сховішчаў, сямейнага тыпу сістэмы Андэрсона. Гэтыя сховішчы ўзмоцнена прапагандыруюцца ўрадам, а насельніцтва забяспечваецца матэрыяламі для іх пабудовы.

Сямейнае сховішча можа быць пабудавана ў любым садку побач з домам або на любой свабоднай пляцоўцы. Для гэтага выкапваецца акоп глыбінёй да метра, шырынёй у паўтара метра і даўжынёй у два. Над акопам устанаўліваецца звод з тоўстага гальванізіраванага хвалістага жалеза. Жалезныя лісты змацоўваюцца па лініі грэбня балтамі; вышыня такога сховішча 1,8 метра. Задняя сцяна закрываецца прамым лістом хвалістага жалеза, пярэдняя сцяна — такім-жа лістом (тут-жа ёсць адтуліна для выхаду). Уся пабудова пакрываецца пластом зямлі таўшчынёй у 50 сантыметраў, маскіруецца — і сховішча гатова. У ім можа памясціцца 8 чалавек.

Сховішчы Андэрсона выпрабоўваліся пад дзеяннем авіябомб вагой у 230 кілограмаў. Было ўстаноўлена, што калі бомбы гэтага калібра падаюць на адлегласці звыш 8 метраў ад сховішча, то апошняе абараняе знаходзячыхся ў ім людзей ад асколкаў і паветранай хвалі, якая ўтвараецца сілай узрыву авіябомбы, а таксама і ад абвальваючыхся частак пабудоў. Гэтыя бомбасховішчы змяншаюць небяспеку ў дзесяткі раз, але поўнай абароны не даюць: пры прамым попадзанні бомбы яны разбураюцца.

У Германіі яшчэ да пачатку вайны пачалі будаваць моцныя сховішчы.

Пры ўстановах, школах, прадпрыемствах і некаторых уласных дамах былі пабудаваны сховішчы на 50—60 і, самае вялікае, на 100 чалавек. Як правіла, у падвальных паверхах новабудоўляў рабіліся моцныя памяшканні, прыстасаваныя пад сховішчы ад паветранага нападу. Апрача таго, былі пабудаваны грамадзкія сховішчы, каб грамадзяне, захапчаныя паветранай трывогай на вуліцы, маглі ў іх схавацца.

Але і ў Германіі сховішчаў для ўсяго насельніцтва нехапае. У ходзе вайны будаўніцтва іх ідзе фарсіраванымі тэмпамі. У Берліне, як паведамляла швейцарская газета «Нацыяналь цэйтунг», створан падземны горад з галерэямі і ходамі. Большасць ходаў звязана з сеткай берлінскага метро.

Пад большасцю берлінскіх шпіталяў і клінік пабудаваны падземныя аперацыйныя пакоі і амбулаторыі.

Для захавання баявой матэрыяльнай часткі: самалётаў, машын, гармат і т. д. у Германіі створаны падземныя ангары, склады, гаражы і іншыя падземныя пабудовы. Для гэтай мэты скарыстаны склалі мясцовасці, што патаняе буйаўніцтва. У ходзе вайны гэтыя памяшканні ў радзе пунктаў скарыстоўваюцца і як сховішчы для грамадзянскага насельніцтва.

Як у Англіі, так і ў Германіі вялікая ўвага звернута на светамаскіроўку прадпрыемстваў, устаноў, транспарта і прыватных дамоў. Светамаскіроўкай дасягаецца тое, што святла на адлегласці далей 500 метраў амаль не відаць.

**Падпалкоўнік П. ВЕДЗЕНІЧЭЎ.**

# ЗА РУБЯЖОМ

## *Вайна ў Еўропе і Афрыцы*

**(Дзённік ваенных дзеянняў)**

На англа-германскім фронце адзначаецца значная актыўнасць германскіх узброеных сіл. Пасля налёту на Плімут у ноч на 21 сакавіка, які, па аданцы агенцтва Рэйтэр, быў найбольш інтэнсіўным за ўвесь час вайны, германская авіяцыя зноў зрабіла ў ноч на 22 сакавіка налёт на гэты горад. У зводцы германскага камандавання паведамляецца, што асноўны ўдар германскай авіяцыі быў накіраван на докі і партовыя пабудовы, на якія былі скінуты бомбы ўсіх калібраў. Па думцы карэспандэнта Юнайтэд Прэс, у налёце на Плімут удзельнічала некалькі сот германскіх бамбардыроўшчыкаў. Карэспандэнт мяркуе, што гэты налёт быў яшчэ больш інтэнсіўным, чым меўшы месца ў папярэднюю ноч. У выніку бамбардыроўкі значная частка горада зусім знішчана. Лічаць, што ў ноч на 22 сакавіка на Плімут было скінута звыш 10 тысяч запальных бомб.

У апошні час узмацнілася актыўнасць германскіх ваенна-марскіх сіл у Атлантычным акіяне. Германскія ваенныя караблі, паведамляецца ў зводцы германскага камандавання, затапілі ў паўночнай частцы Атлантычнага акіяна 22 англійскія гандлёвыя параходы.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 22 сакавіка англійскія самалёты зрабілі налёт на некаторыя пункты на тэрыторыі акупіраванай Францыі. Асабліва інтэнсіўнай бамбардыроўцы падвергся горад Ларыан.

***

На албанскім фронце адбываліся баі мясцовага характару. Абедзве ваюючыя краіны вялі артылерыйскую перастрэлку. Італьянцы, спасылаючыся на югаслаўскую газету «Врэме», перагрупіроўваюць свае войскі і ўмацоўваюць новыя пазіцыі. Італьянцы бесперапынна атрымліваюць новыя падмацаванні.

Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі паведамляе аб правале аталкі італьянскіх танкавых часцей.

Актыўна дзейнічала на албанскім фронце авіяцыя ваюючых старон. Італьянскія самалёты, указваецца ў зводцы вярхоўнага камандавання італьянскай арміі, падвергалі бамбардыроўцы марскую базу Прэвезы.

Прыкметна ажывіліся ваенныя дзеянні ва ўсходняй частцы Міжземнага мора. 21 сакавіка, адзначаецца ў зводцы германскага камандавання, германскія бамбардыроўшчыкі атакавалі на поўначы ад востраву Крыт англійскі караван суднаў, які ішоў пад моцным канвоем. 2 вялікія судны затоплены, а адно — пашкоджана. У тэрытарыяльных водах востраву Мальты пашкоджан англійскі эсмінец. У Эгейскім моры, паведамляецца ў італьянскай зводцы, італьянскія самалёты бамбардыравалі грэчаскую базу на востраве Лесбос.

***

Умацаваны аазіс Джарабуб (Лівія), асада якога працяжалася 4 месяцы, занят англічанамі. Англійскія і аўстралійскія часці, гаворыцца ў камунікеі камандавання англійскіх сіл на Блізкім Усходзе, прымусілі італьянскі гарнізон капітуляваць 21 сакавіка пасля поўдня. Узята каля 800 палонных, у тым ліку камандуючы гарнізонам.

Ва Ўсходняй Афрыцы, у раёне Керэна (Эрытрэя), працяжаюцца жорсткія баі. Італьянцы працрымаюць частыя контратакі супроць пазіцый англічан. У камунікеі англійскага камандавання на Блізкім Усходзе адзначаецца, што аперацыі англійскіх войск у раёне Керэна развіваюцца марудна.

Англійскія войскі, аперыруючыя ў Паўднёвай Абісініі, прадаўжаюць пяснціць італьянскія часці ў раёне Негелі. Буйным італьянскім сілам, сканцэнтраваным у раёне Негелі, гаворыцца ў паведамленні агенцтва Рэйтэр, пагражаюць дзве калоны — адна, якая прасоўваецца з захаду з Явела, другая — з усходу з Дола. У Паўночнай Абісініі англійскія часці зноў прабавалі фарсіраваць раку Дабус (недалёка ад граніцы Антла-Егіпецкага Судана). Спроба англічан, згодна італьянскай зводцы, не ўвянчалася поспехам.

22 сакавіка. (ТАСС).

## Германскае камунікіе аб перагаворах Гітлера з Бардошы

БЕРЛІН, 22 сакавіка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Мюнхена камунікіе, у якім гаворыцца, што ўчора ў прысутнасці міністра замежных спраў Рыбентропа Гітлер у сваёй рэзідэнцыі ў Мюнхене прыняў міністра замежных спраў Венгрыі Бардошы. Пасля сканчэння перагавораў міністр замежных спраў Венгрыі прадставіў Гітлеру суправаджаўшых яго асоб.

## Германскія рэйдэры ў Атлантычным акіяне

ЛОНДАН, 22 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе ваенна-марскі аглядальнік агенцтва Рэйтэр, у аўтарытэтных лонданскіх кругах стала вядома, што германскія лінкоры «Шарнгорст» і «Гнейзенау» водазмяшчэннем па 26 тысяч тон кожны прарваліся ў Атлантычны акіян. Прэм'ер-міністр Чэрчыль у сваёй прамове 17 сакавіка паведаміў аб двух германскіх рэйдэрах, якія аперыруюць далёка к захаду, аж да 42 мерыдыяна. Атрыманыя пазней паведамленні пацвярджаюць меркаванне аб тым, што гэтымі рэйдэрамі з'яўляюцца «Шарнгорст» і «Гнейзенау».

«Шарнгорст» быў закладзен у 1934 годзе і закончан пабудовай у 1939 годзе, «Гнейзенау» — закладзен у 1934 годзе і закончан пабудовай у 1938 годзе. Абодва караблі маюць праектную скорасць у 27 вузлоў, але пры выпрабаваннях паказалі скорасць звыш 29 вузлоў. На крэйсерскай скорасці яны могуць аставацца ў моры каля трох тыдняў, не папаўняючы запасаў гаручага. Абодва караблі аднатыпны і ўзброены дзевяццю 11-дзюймовымі гарматамі кожны.

## Мерапрыемствы ў Англіі на выпадак хімічнай вайны

ЛОНДАН, 22 сакавіка. (ТАСС). Англійскі міністр унутраных спраў і ўнутранай бяспасці Марысон прапанаваў усім уладальнікам аптэк ў Англіі прыняць удзел у правядзенні падрыхтоўчых мерапрыемстваў на выпадак хімічнай вайны. Усе ўладальнікі прыняўшыя гэтую прапанову, будуць забяспечаны неабходнымі медыкаментамі супроць абпалаў атручваючымі вяшчэствамі скуранога дзеяння. У выпадку хімічнай трывогі гэтыя медыкаменты разам з простымі інструкцыямі па самаабароне будуць выстаўляцца ля ўваходу ў аптэкі.

## Праследванні комуністаў у Францыі

ВІШЫ, 22 сакавіка. (ГАСС). Як паведамляюць французскія газеты, тулузскі ваенны трыбунал прыгаварыў 12 комуністаў да турэмнага зняволення тэрмінам ад 4 месяцаў да 4 год і, апрача таго, да грашовага штрафу. У Монпелье адзін комуніст прыгаворан да 2 год і двое—да трох год турэмнага зняволення, а таксама да грашовага штрафу.

## 2.800 КІЛОМЕТРАЎ НА АЭРАСТАЦЕ

**ВЫДАТНЫ ПАЛЁТ СОВЕЦКІХ АЭРАНАЎТАЎ Б. А. НЕВЕРНАВА І С. С. ГАЙГЕРАВА**

Совецкія аэранаўты Б. А. Невернаў і С. С. Гайгераў зрабілі 13—16 сакавіка выдатны дальні працяжны палёт на аэрастаце «СССР ВР-73» аб'ёмам у 900 кубаметраў.

Ён ляцеў у тылу цыклона, робячы зігзагавы шлях. У дзень старта аэранаўты скінулі вымпел у раёне Тулы. На наступныя суткі вымпелы былі знойдзены ў Пензенскай абласці. Адзін з іх аэранаўты скінулі ў раёне Кузнецка, які прайшлі ў 17 гадзін 14 сакавіка. Затым сувязь з аэрастатам «СССР ВР-73» была страчана. Ён ішоў, як відаць, далёка ад населеных пунктаў. 20 сакавіка было перадана ў Маскву, што аэрастат бачылі 16 сакавіка над Чэлябінскай абласцю, ідучым на ўсход.

21 сакавіка ў канцы дня ў Цэнтральным інстытуце падвор'я было атрымана паведамленне Б. А. Невернава і С. С. Гайгерава:

«Пасадка ў раёне вёскі Шчэйкіна, Калыванскага раёна, Новасібірскай абласці. Працяжнасць палёту — 69 гадзін 30 мінут».

Такім чынам, згодна папярэдніх даных, Б. А. Невернаў і С. С. Гайгераў праляцелі па прамой каля 2.800 кілометраў. Гэтым палётам яны значна перавысілі цэлую серыю міжнародных рэкордаў працяжнасці і дальнасці, устаноўленых у розны час совецкімі і бельгійскімі аэранаўтамі.

У час свайго палёту Б. А. Невернаў С. С. Гайгераў правялі вельмі важныя навуковыя назіранні за трансфармацыяй паветраных мас. Упершыню ўдалося на працягу доўгага часу прасачыць за зменнямі патоку арктычнага паветра ў тылу цыклона. Гэтыя даныя з'яўляюцца значным укладам у навуку аб палвор'і, памогуць метэаролагам больш дакладна прадказваць стан метэаралагічных умоў на доўгі перыяд.

## У ДОМІКУ, ДЗЕ АДБЫВАЎСЯ ПЕРШЫ З'ЕЗД РСДРП

Па Совецкай вуліцы, у Мінску знаходзіцца невялікі аднапавярховы драўляны домік, агароджаны невысокім жалезным плотам. Дом гэты лічыцца за № 141. На мемарыяльнай дошцы, прыбітай да яго фасада, вялікімі пазалочанымі літарамі выбіта: «Тут адбываўся Першы з'езд РСДРП 13—15 (1—3) сакавіка 1898 года».

43 годы пазад у гэтым доміку, па былой Захар'еўскай вуліцы пражываў кантралёр Лібава-Роменскай чыгункі Пётр Румянцаў. У яго кватэры сабраліся дэлегаты з'езда. Зараз тут знаходзіцца філіял музея Рэволюцыі БССР.

У 8 пакоях выстаўлен рад гістарычных дакументаў, матэрыялаў, мастацкіх карцін, фотаздымкаў, дыяграм, у якіх адлюстравана слаўная рэволюцыйная дзейнасць правадыроў сусветнага пролетарыята таварышоў Леніна і Сталіна.

Спецыяльны раздзел прысвечан падрыхтоўцы і правядзенню Першага з'езда РСДРП, прабыванню Леніна ў гэты час у ссылцы, яго барацьбе з эканамізмам.

Другі аддзел прысвечан пачатку арганізаванага рабочага руху, стварэнню ленінскай «Искры», рэволюцыйнай рабоце таварыша Сталіна ў Закаўказзі ў 1900—1903 гг.

Вялікую цікавасць прадстаўляюць экспанірыемы арыгінал першага нумара газеты «Искра» і макет чамадана з двайным дном, у якім газета нелегальна правозілася з-за граніцы ў Расію, і т. д.

Музей-домік з пачатку гэтага года наведала каля 3.000 чалавек.

Злева направа: М. Батвінік, А. Ліліенталь, П. Керэс, І. Бандарэўскі, В. Смыслоў, І. Балеславускі.

Сёння ў Ленінградзе пачынаецца матч-турнір на званне абсалютнага чэмпіёна СССР па шахматах, у якім прымаюць удзел 6 пераможцаў XII шахматнага чэмпіяната СССР.

Жэраб'ёўка ўстанавіла наступны парадак размяшчэння ўдзельнікаў у турнірнай таблицы: 1. Батвінік, 2. Ліліенталь, 3. Керэс, 4. Бандарэўскі, 5. Смыслоў, 6. Балеславускі.

Званне абсалютнага чэмпіёна краіны па шахматах уводзіцца ў СССР ўпершыню і, відавочна, будзе вышэйшым шахматным званнем на тэрмін да наступнага аналагічнага спаборніцтва.

Такое спаборніцтва павінна выключаць магчымасць «выпадковасцей», «турнірнага шчасця» — і можа быць або матчам, або матч-турнірам, дзе удзельнікі сустракаюцца кожны з кожным па некалькі разоў.

У совецкай шахматнай арганізацыі зараз такія кадры, якіх не мае ні адна краіна ў свеце. Таму турнір шасці таленавітейшых совецкіх шахматыстаў, дзе кожны з кожным сыграе па 4 партыі, прадстаўляе выдатнейшую з'яву, і пераможца яго — абсалютны чэмпіён СССР — мае ўсе падставы прэтэндаваць на барацьбу за званне чэмпіёна свету.

Наўрад ці ёсць сэнс гаварыць аб шансах асобных удзельнікаў — кожны з шасці можа быць першым. Але і апошняе месца ў гэтым турніры будзе належаць аднаму з лепшых шахматыстаў нашай краіны, а гэта значыць і ўсяго свету.

Першая палавіна турніра іграецца ў Ленінградзе, другая — у Маскве. Сёння іграюць: Батвінік—Балеславускі, Ліліенталь—Смыслоў, Керэс—Бандарэўскі. Заўтра: Балеславускі—Бандарэўскі, Смыслоў—Керэс, Батвінік—Ліліенталь.

Па зацверджанаму рэгламенту кожнаму на першыя 40 ходаў даецца 2 гадзіны 30 мінут, а ў далейшым — па 16 ходаў у гадзіну. Працяжнасць ігры — 5 гадзін. Даігрыванне адкладзеных партый—пасля другога, пятага, восьмага і дзесятага тураў.

## ПРЭМ'ЕРА ОПЕРЫ „ТРАВІЯТА"

Учора Вялікі ордэна Леніна Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР паказаў прэм'еру оперы Вердзі «Травіята». Гэта—шостая прэм'ера тэатра ў бягучым сезоне.

Паставіў спектакль заслужаны артыст РСФСР І. Ю. Шлепянаў; дырыжор—заслужаны дзеяч мастацтваў БССР М. Э. Шнейдэрман, мастак — заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР М. М. Чэрэмных, супастаноўшчык — рэжысёр Тэатра оперы і балета БССР В. М. Шахрай, хормейстар—заслужаны артыст БССР А. А. Бельскі.

Галоўныя партыі ў прэм'еры выконвалі: Віялета—заслужаная артыстка БССР Л. Ф. Аляксеева, Альфрэд Жэрмон—заслужаны артыст БССР В. Ф. Лапін, Жорж Жэрмон — заслужаны артыст БССР М. І. Дзянісаў, Лора Бэрвуа—артыстка А. Т. Касценіч.

Прэм'ера прайшла з вялікім поспехам.

## СЁННЯ—ПАЧАТАК ВЕСНАВЫХ КАНІКУЛ У ШКОЛАХ

У гарадскіх школах рэспублікі пачаліся сямідзённыя веснавыя канікулы школьнікаў.

Дні адпачынку мінскіх рэбят будуць насычаны цікавымі культурна-масавымі мерапрыемствамі. Ва ўсіх школах адбудуцца атрады дзіцячай самадзейнасці.

У Палацы піонераў і акцябрат веснавое свята вучняў 1—2-х класаў пачнецца ранішнікам казак. Удзельнікі аддзела тэхнікі разам з гурткамі школ і Цэнтральнай дзіцячай тэхнічнай станцыяй наладжваюць вечар тэхнікі. Юныя натуралісты сустрэнуцца з вучонымі, знатнымі калгаснікамі і раскажуць ім аб сваёй рабоце.

У Палацы піонераў і акцябрат створан спецыяльны пакой, у якім адлюстравана жыццё і рэволюцыйная дзейнасць правадыроў рэволюцыі Леніна і Сталіна. Для наведання гэтага аддзела арганізуюцца экскурсіі вучняў горада.

Цікавымі будуць спартыўныя мерапрыемствы ў дні канікул. Група юных лыжнікаў і канькабежцаў выехала ў горад Архангельск для ўдзелу ва ўсесаюзным спаборніцтве школьнікаў. Каманды школьнікаў стадыёна юных піонераў горада Масквы і пінскага Палаца піонераў прыязджаюць у Мінск для ўдзелу ў турніры з юнымі шашыстамі і шахматыстамі.

У дзіцячым кінатэатры штодзённа будуць дэманстравацца лепшыя кінафільмы; будуць арганізаваны ігры, песні, танцы, мастацкае чытанне.

За дні канікул у кінатэатры школьнікі сустрэнуцца з артыстамі, пісьменнікамі, кінарэжысёрамі. Каманцзіры Чырвонай Арміі правядуць гутаркі аб палкаводцу Суворавым; архітэктары раскажуць аб генеральным плане рэканструкцыі горада Мінска.

## *Спартыўная хроніка*

⊙ Усебеларускі Камітэт па справах фізкультуры і спорта пры СНК БССР атрымаў згоду ад Камітэта па справах фізкультуры і спорта пры СНК Літоўскай ССР на правядзенне таварыскага матча па шахматах паміж зборнымі камандамі БССР і Літоўскай ССР. Матч намечана правесці 13 красавіка.

⊙ 28 сакавіка ў Беластоку пачнуцца ўсебеларускія спаборніцтвы па боксу, а таксама традыцыйная сустрэча 5 дзіцячых спартыўных школ па гэтаму віду спорта. Званне чэмпіёнаў рэспублікі 1941 года будзе аспрэчваць каля 80 дарослых і юных баксёраў.

⊙ У басейне мінскага акруговага Дома Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава адбыліся спаборніцтвы па плаванню. Удзельнічала 20 плаўцоў зборнай каманды Мінска, якія рыхтуюцца да матча сямі гарадоў па плаванню.

# ШАХМАТЫ

## Вучэбны конкурс.

**Як чорныя дабіваюцца рашаючай перавагі.**



Ход чорных.

Гэтым заданнем мы заканчваем раздзел «Мат на апошняй гарызанталі». У сувязі з матч-турнірам шасці мацнейшых і прадстаяннем з 13 красавіка шахматным і шашачным чэмпіянатамі БССР, — зучэбны конкурс перарываем да мая месяца. Тэрмін адсылкі рашэнняў усіх заданняў — праз дзесяць дзён.

**Рашэнне задання № 1**

**(«Звязда» ад 2 сакавіка)**

Белыя выйграюць шляхам знішчэння адной з абараняючых 8-ю гарызанталь ладдзей: Фе2 : с8! — браць ферзя нельга з-за мата ў два хады.

Правільнае рашэнне прыслалі тт. **Баркан, Коблент** і **Севасьцянаў** (Мінск), **Супін** і **Ткач** (Рудзенск), **Дразд**оў і **Курапаненкаў** (Слабодка, Магілеўскага раёна), **Эйхель** (Моладава, Пінскай абласці), **Маслоўскі** (Хойнікі), **Шурпо** (Смальяны, Аршанскага раёна), **Чарышкін** (Гарадок), **Паршын** (Гомель), **Селеўцоў** (Баена, Дубровенскага раёна), **Русецкая** (Бабруйск).

**Арганізуем індывідуальнае шэфства**

Калгаснік калгаса «Чырвоны май», Слуцкага раёна, тав. Дамарад нядрэнна іграе ў шашкі, але хацеў-бы павысіць сваю кваліфікацыю.

Майстар І. С. Гардон (Мінск) бярэ індывідуальнае заочнае шэфства над тав. Дамарадам і выклікае ўсіх кваліфікаваных шашыстаў рэспублікі на арганізацыю такога шэфства.

Рэдакцыя «Звязды» бярэ на сябе дапамогу ў арганізацыі шэфства кваліфікаваных шахматыстаў і шашыстаў над калгаснымі секцыямі, асобнымі шахматыстамі і шашыстамі.

## ПЕРШЫНСТВА БССР ПА ШТАНЗЕ

ВІЦЕБСК, 22 сакавіка. **(Па тэлефону).** Сёння ў клубе імені Клары Цэткін пачаліся спаборніцтвы па штанзе на асабістае першынства БССР. У спаборніцтве прымаюць удзел 50 штантістаў Мінска, Віцебска, Брэста, Магілева і іншых абласцей рэспублікі.

Першы дзень спаборніцтва пачалі штангісты лягчэйшай, поўлёгкай і лёгкай вагі. Званне чэмпіёна рэспублікі ў найлягчэйшай вазе заваяваў тав. Таўгер (Мінск)—студэнт Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага сцяга інстытута фізічнай культуры. Ён набраў у трыбор'і 252,5 кілограма. У поўлёгкай вазе званне чэмпіёна рэспублікі—трынаццаты раз падрад—заваяваў майстар спорта СССР Лапідус, які набраў 290 кілограмаў. У лёгкай вазе званне чэмпіёна заваяваў Шапіра (Мінск, «Будаўнік цэнтра»), які паказаў у трыбор'і 277,5 кілограма.

Спаборніцтвы прадоўжацца два дні.

## Паведамленні

Марксісцка-ленінскі універсітэт выхадного дня пры Доме партыйнай асветы Мінскага гаркома КП(б)Б паведамляе ўсіх слухачоў, што 23 сакавіка, у 11 гадзін раніцы, у малой зале Дома партыйнай асветы адбудуцца чарговыя заняткі. Будуць прачытаны лекцыі: **«Марксізм-ленінізм аб інтэлігенцыі»** — чытае акадэмік **Вальфсон**; **«Дзекабрысты»** — чытае кандыдат гістарычных навук т. **Лочмель**.

24 сакавіка, у 12 гадзін дня, у памяшканні Дома пісьменніка адбудуцца чарговыя заняткі Універсітэта марксізма-ленінізма пісьменнікаў і артыстаў. Лекцыю **«Аб творчасці Гліньі»** чытае т. **Карповіч**.

Лекцыю на тэму **«Перамога рускага народа над арміяй Напалеона»** чытае кандыдат гістарычных навук т. **Шлёзберг**.

Уваход па абанементу пісьменнікаў і артыстаў.

Сёння, у 8 гадзін вечара, у лекторыі Беларускага Дзяржаўнага універсітэта (памяшканне біялагічнага корпуса, ауд. 313) адбудзецца лекцыя дацэнта **Зубковіча Е. М.** на тэму **«Сучасныя даныя аб паходжанні чалавека»**.

Уваход свабодны.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.


**У ТЭАТРАХ І КІНО**

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

23 і 24 сакавіка
ДУРА ДЛЯ ІНШЫХ, РАЗУМНАЯ ДЛЯ СЯБЕ

Пачатак у 8 г. 30 м. вечара.
Па калектыўных заяўках прадастаўляецца скідка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

23 сакавіка
ранішнік для школьнікаў
«КОЛДУНЬЯ»
Пачатак у 12 г. дня:
вечарам —
«ЗА АКІЯНАМ»
Пачатак у 8.30 вечара.
24 сакавіка
«КОЛДУНЬЯ»
Пачатак у 8.30 вечара.
Льготныя талоны сапраўдны да 1 красавіка.

АКРУГОВЫ ТЭАТР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЗАХАВА
(Мінскі Дом Чырвонай Арміі)
Гастролі Маскоўскага тэатра камедыі ПДКА

23 сакавіка ранішнік
«САДЫ ЦВЕТУТ»
Пачатак у 12 г. дня;
вечарам —
«ПОХИЩЕНИЕ ЕЛЕНЫ»
Пачатак у 8.30 вечара.

МІНСКАМУ АЎТАРАМОНТНАМУ ЗАВОДУ
патрэбны:
СЛЕСАРЫ, КАВАЛІ ЗВАРШЧЫКІ КЛЯПАЛЬШЧЫКІ І НЕКВАЛІФІКАВАНЫЯ РАБОЧЫЯ
Звяртацца Магілеўскае шасе, д. 8, тэлефон 23-866.

Дзяржаўны тэатр юнага гледача БССР імені Н. К. Крупскай
(Памяшканне Палаца піонераў)
23 сакавіка
М. Светлоў.
КАЗКА
П'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 6 г. веч. Каса з 11 г. ран. да 6 г. веч.
Прымаюцца калектыўныя заяўкі па тэл 21-812.
Гэтымі днямі прэм'ера
Прадзелкі Скапена

Кінатэатр «Чырвоная Зорка»
ВАЛЕРЫЙ ЧКАЛАЎ
Сеансы: 5.45. 7.30. 9.15 і 11 г. веч.

Кінатэатр «Родина»
КАНЦЭРТ-ВАЛЬС
Сеансы: 6.30. 7.45. 9.15 і 11 г. вечара.

Кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ЛЮДЗІ НАШАГА КАЛГАСА

Дзіцячы кінатэатр
Дзённыя сеансы
САЛАВАТ ЮЛАЕЎ
Вячэрнія сеансы для дарослых
САЛАВАТ ЮЛАЕЎ

Кінатэатр «Навіны дня»
(б «Спартак»)
1. Родная кроў (навукова-папулярны фільм).
2. Пенаты (відавы кінанарыс)
3 Саюзкінажурнал №№ 22 і 23.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР
23 сакавіка прэм'ера
ТРАВІЯТА
Опера ў 4 актах, музыка Вердзі.
Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Беларуская кантора „ГЛАВКИНОПРОКАТ"
ВЫПУСКАЕ
НА ЭКРАНЫ КІНОТЭАТРАЎ РЭСПУБЛІКІ
МАСТАЦКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ
ВЫПАДАК У ВУЛКАНЕ
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
артысты П. АЛЕЙНІКАЎ, В. ШЫШКІН, Л. СМІРНОВА, ордэнаносец М. ТРАЯНОЎСКІ.
ВЫТВОРЧАСЦЬ КІНОСТУДЫІ «СОЮЗДЕТФИЛЬМ».

ПАРОЖНЮЮ ПАСУДУ АД ПІВА І НАПІТКАЎ КУПЛЯЮЦЬ
АД НАСЕЛЬНІЦТВА ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК
УСЕ ЛАРКІ І МАГАЗІНЫ МІНЛАРКА
і піўзавода „Беларусь"
па цане 0,5 і 0,6 — 50 кап. за бутэльку.
Грамадзяне, здавайце парожнюю пасуду.
Аб усіх выпадках адмовы ў прыёме пасуды запісвайце ў кнігу скаргаў магазіна або ларка, або званіце па тэлефону 21-752, завод «Беларусь», і № 21-305 Мінларок.
ДЫРЭКЦЫЯ.


# БАЛАНС

## ДРУКАРНІ імені 1-га МАЯ (гор. Барысаў)

**НА 1 СТУДЗЕНЯ 1941 г.**

| АКТЫЎ | СУМА на 1/I 1940 г. | СУМА на 1/I 1941 г. | ПАСІЎ | СУМА на 1/I 1940 г. | СУМА на 1/I 1941 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Асноўныя сродкі, будынкі, абсталяванні, машыны і станкі | 212817—44 | 221432—32 | Статутны фонд | 256567—12 | 246871—39 |
| Адвлячоныя сродкі, узносы ў бюджэт | 62002—30 | 102200—00 | Фонд дырэктара | 10017—09 | 25566—35 |
| Адлічэнні ў фонды | 11289—00 | 26138—00 | Прыбытак да справаздачнага года | 99121—78 | — |
| Матэрыялы, сыравіна і паліва | 43466—08 | 32131—12 | Прыбытак за справаздачны перыяд | — | 122238—08 |
| Незакончаныя заказы | 10386—06 | 12958—69 | Амартызацыйны фонд у распараджэнні дырэктара | 4867—77 | 6300—00 |
| Гатовая прадукцыя | 629—20 | 56—55 | Амартызацыйны фонд, падлягаючы ўзносу ў банк (прамысловы) | 4050—04 | 5805—52 |
| Тавары адгружаныя | 8327—34 | 13121—59 | Разлікі з крэдыторамі | 30745—26 | 17881—96 |
| Тавары неаплачаныя | 5156—46 | 1701—84 | | | |
| Расходы будучага перыяда | 1012—40 | 708—57 | | | |
| Грашовыя сродкі | 41892—55 | 5657—40 | | | |
| Сродкі ў разліках | 8390—23 | 8557—22 | | | |
| БАЛАНС | 405369—06 | 424663—30 | БАЛАНС | 405369—06 | 424663—30 |
| | | | ЗА БАЛАНСАМ. Знос асноўных сродкаў | 30789—62 | 39704—46 |

**РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА 1940 год**

| УБЫТКІ | СУМА | НАКАПЛЕННІ | СУМА |
|---|---|---|---|
| Розныя ўбыткі | 2519—37 | Прыбытак ад рэалізацыі | 123164—03 |
| Сальдо прыбыткаў | 122238—08 | Іншыя накапленні | 1593—42 |
| РАЗАМ | 124757—45 | РАЗАМ | 124757—45 |

Дырэктар друкарні ЮДЗІН.

Бухгалтар МАРАНЕ.

Баланс разгледжан і зацверджан Мінскім абласным аддзелам мясцовай прамысловасці 5 сакавіка 1941 г. (Пратакол № 2)

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20.000 (камутатар), дадатковы 102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88, адказны сакратар — 2-13-53; намеснік адказнага сакратара — 2-13-99, сакратарыят — 2-39-55 Аддзелаў: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46 літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30 літработнікаў — 2-15-56; літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-85, аддзел рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, заг. выдавецтва — 2-13-58; бухгалтэрыя выдавецтва і аддзел абмену — 2-08-44; выпускаючы — 2-47-68, карэктарская — 2-13-57.

У1642. Друкарня газеты «Звязда». Кр., Ш., Ш.